PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 15 (2448) Год XLVIII | Беласток, 13 красавіка 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Моц сімвалу

Чым больш святкаванне 25 Сакавіка выцясняецца-праследуецца ў Беларусі, тым больш шырока і адкрыта дэманструецца яно ў беларускім замежжы. Гэта ўжо чацвёрты нумар нашай газеты, у якім адзначаем мерапрыемствы прымеркаваныя да 85 гадавіны беларускага Дня волі ў Польшчы або пра яго звычайна гаворым.

Беларускія сімвалы, а ў іх ліку і дата 25 Сакавіка, апынуліся ў становішчы, якое найлепш выявілася сёлета ў лёсе гродзенскага лідэра Беларускага народнага фронту Мікалая Ворана. М. Ворана арыштавалі 23 сакавіка за ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу ў Гродне і 27 сакавіка засудзілі на сем дзён турмы. У суседскім нам Гродне сотня чалавек сабралася ля мемарыяльнай дошкі на доме, у якім у 1918-1919 гг. засядаў урад Беларускай Народнай Рэспублікі. М. Ворана арыштавалі за тое, што ўзяў слова і расказаў сабраным пра гісторыю БНР. Адбылося тое, паводле лідэра БНФ, у час калі па Гродне бесперашкодна прахаджваліся неафашысцкія групоўкі са свастыкамі на рукавах.

85 гадавіну абвяшчэння БНР ушанавалі ў Польшчы ліцэісты і студэнты. У беларускім ліцэі ў Бельску-Падляшскім мерапрыемствы працягваліся тры дні — 25-27 сакавіка — і мелі яны народны (вучні прэзентавалі ў сваёй школе беларускую традыцыю), сучасна-забаўляльны (канцэрт гродзенскага акцёра і барда Віктара Шалкевіча), ды і навукова-адукацыйны характар (сустрэчы трэціх і чацвёртых класаў з прафесарамі Васілём Белаказовічам і Яўгенам Мірановічам). 23 сакавіка варшаўскі гурток Беларускага аб'яднання студэнтаў у Польшчы наладзіў у Варшаўскім універсітэце цыкл дакладаў прысвечаных беларуска-польскім літаратурным сувязям. Дакладчыкамі выступілі Часлаў Сэнюх (пераклад „Новай зямлі" на польскую мову), Алег Мінкін (пераклады Норвіда і Лесмяна на беларускую мову) і ніжэйпадпісаны (пераклады сучаснай беларускай літаратуры на польскую мову). Вялікую частку аўдыторыі склалі студэнты беларускай філалогіі — з кожным годам паступае туды ўсё больш палякаў, якія... зараз свабодна выказваюцца на беларускай мове.

Пабываць у бельскім ліцэі і сярод варшаўскіх студэнтаў было тым больш прыемна, таму што гэта маё пакаленне ў гады сваёй маладосці пачало ў Польшчы адкрыта (у Беларусі сказалі б: афіцыйна, санкцыянавана) святкаваць 25 Сакавіка. Не думаю, каб цяпер хто-колечы з маіх сяброў успамінаў тое ў катэгорыях выключнага геройства, але выхад на прасцяг адкрытасці не быў зразу такім простым.

Аляксандр Максімюк

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ян Бусловіч ля новага прэса

У Еўропе аднолькавых шанцаў

Першы ў ваяводстве

Аляксей Мароз

У лютым 2003 года Ян Бусловіч з Ягуштова (гміна Бельск-Падляшскі) атрымаў са Спецыяльнай праграмы па далучэнні вёскі і сельскай гаспадаркі да ЕС „SAPARD" фінансавую дапамогу размерам 33 900 злотых. Выкарыстаў яе на дафінансаванне куплі прэса для пакавання ў кіпы сіласу і фармавання ў рулоны саломы і сена, машыны для ўпакоўкі сіласу ў фольгу, прычэпа і абсталявання для падымання грузаў. Ян Бусловіч быў першым у Падляшскім ваяводстве гаспадаром, якому прызначылі дапамогу са згаданай праграмы.

„SAPARD" (Special Accession Programme for Agriculture and Rural Development) — гэта праграма адрасаваная краінам Сярэдне-Усходняй Еўропы, якія маюць намер далучыцца да Еўрасаюза. Фінансавыя сродкі гэтага фонду маюць дапамагчы ў развіцці вёскі і інтэграцыі сельскагаспадарчага сектара краін-кандыдатак з супольнай аграрнай палітыкай і структурнымі праграмамі Еўрапейскага Саюза. Гадавы аб'ём прызначаных Польшчы сродкаў складае каля 170 мільёнаў еўра. Могуць яны быць выкарыстаны на паправу канкурэнтаздольнасці польскай сельскай гаспадаркі, яе прыстасаванне да санітарных, гігіенічных і якасных патрабаванняў супольнага рынку і на развіццё тэхнічнай інфраструктуры. Фондам „SAPARD" могуць карыстацца перапрацоўчыя прадпрыемствы, паасобныя сяляне, сельскагаспадарчыя калектывы і мясцовыя самаўрады.

— Калі прапануюць грошы, трэба хадайнічаць аб іх атрыманні. Трэба толькі сабе дапамагчы, — заяўляе Ян Бусловіч. — Заахвочваю іншых гаспадароў выступаць за дапамогай, бо зараз размеркаваны толькі 10% фондаў, прадбачаных на развіццё сельскай гаспадаркі.

У канцы лютага ў Падляшскім ваяводстве пададзеных было 75 заяў ад індывідуальных гаспадароў і гаспадарчых адзінак, якія намерваюцца інвеставаць у развіццё сельскай гаспадаркі. Выступілі яны за дапамогай з праграмы „SAPARD" велічынёю ў 3 511 808 злотых. 12 заяў даслалі ў Падляшскае бюро „SAPARD" павятовыя ўлады, 102 гмінныя і адно саюз гмін.

Спадар Ян Бусловіч аб магчымасці дафінансавання інвестыцый з праграмы „SAPARD" даведаўся са сродкаў масавай інфармацыі. У мінулых гадах рабіў сіласы пазычанымі машынамі і рашыўся выкарыстаць дапамогу на куплю новых. Трэба было аднак спяшацца, бо дапамога накіраваная была да гаспадароў узростам да пяцідзесяці гадоў жыцця. Прашэнні можна было дасылаць ад 17 ліпеня 2002 года, а 6 жніўня спадару Яну споўнілася б 50 гадоў. Усе дакументы трэба было падаць да 5 жніўня і таму хутка пачаў іх камплектаваць. Ездзіў за пасведчаннямі з Касы сельскагаспадарчага грамадскага страхавання, Казначэйскай палаты, падрыхтаваў кантрактацыйныя дамовы і адкрыў асобны банкаўскі рахунак. У Бельскім бюро Сельскагаспадарчага дарадчага асяродка абяцалі дапамагчы выканаць бізнес-план. Аднак работа адтэрмінавалася, бо працаўнікі самі вучыліся на курсах складаць бізнес-планы. Хаця толькі ў канцы ліпеня пачалася работа з бізнес-планам, работнікі асяродка і Ян Бусловіч справіліся тэрмінова. Спадар Бусловіч паспеў здаць дакументы ў бюро „SAPARD" пры Беластоцкім агенцтве рэст-

[працяг ☞ 3]

Вось і маем бюджэт (бяды) ☞ 3

Шмат эмоцый у час апошняй сесіі выклікаў працяг атакаў LPR на Цэнтр мастацтваў, культур і народаў „Пагранічча" ў Сейнах. На думку гэтага клуба, вядзе ён антыпольскую дзейнасць, выдае шкодныя публікацыі. Гаворка пра „Суседзяў" Тамаша Гроса, кнігу прысвечаную спаленню ядвабненскіх яўрэяў пры актыўным удзеле мясцовых палякаў.

Агрэсія, якую завуць вызваленнем ☞ 4

У Польшчы вайну супраць Ірака падтрымлівае большасць палітыкаў і меншасць грамадства. Аднак пратэставаць супраць агрэсіі на Ірак выходзіць толькі пару соцень маладых чалавек. Хаця папа рымскі выказаўся, як сапраўдны хрысціянін, супраць вайны, мала хто з богапаслухмяных палітыкаў над Віслай падзяляе яго пункт гледжання.

За шведскім юбілейным сталом ☞ 5

Адкасілі дзве касы (77) якіх так баяўся вядомы ўсім нам Віктар Швед, дык абяскодзіў іх... вершам. А ў гэтым годзе, у 78 гадавіну паэта з Мора, 23 сакавіка, святкавалі мы ўсім кагалам — старыя і малыя беларусы, а ўсё гэта адбылося ў паўнюткай зале Цэнтра праваслаўнай культуры ў Беластоку.

25 Сакавіка ў Гданьску ☞ 8

Так як адсвяткавалі 25-га Сакавіка ў Гданьску — у Беластоку нельга нават уявіць. Патранат над 85-й гадавінай абвяшчэння БНР узяў прэзідэнт горада Павел Адамовіч.

Далейшае святкаванне праходзіла ў самым прэстыжным месцы горада — у Двары Артуса. У актавай зале прагучэлі незалежніцкія гімны „Мы выйдзем шчыльнымі радамі" і „Магутны Божа".

Чаму ў белгімназію? ☞ 9

Гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы прапануе добрыя ўмовы для вучобы і высокі ўзровень навучання і таму ў мінулых гадах было многа ахвотных вучыцца ў гэтай школе. Вучоба адбываецца ў новым дыдактычным будынку, узведзеным у 1993 годзе.

Пазнавалі па вопратках ☞ 10

Назбіралі людзі хабару — палатна на касцюмы, і падаліся ў Супрасль да нямецкага начальніка, каб дазволіў пахаваць нябожчыкаў. 19 кастрычніка дазволілі іх забраць. Ноччу, хто якую труну збіў з дошак, забіралі пабітых у стадолу і ў такую труну клалі. Нябожчыкаў пазнавалі па вопратках.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Фота РАМАНА ВАСІЛЮКА

Мікола Маркевіч на будове баптысцкага храма ў Асіповічах

Фота РАМАНА ВАСІЛЮКА

Павел Мажэйка ў тартаку ў Жлобіне

Не захварэлі на страх

Мікола Маркевіч і Павел Мажэйка пасля шасці месяцаў ссылкі вярнуліся ў Гродна. Галоўны рэдактар „Пагоні" — засуджаны на паўтара года прымусовых работ — будзе працягваць пакаранне ў родным горадзе. Можа жыць у сваёй кватэры і мае абавязак знайсці працу, а частку зарплаты аддаваць дзяржаве. Паўла Мажэйку ўмоўна датэрмінова вызвалілі.

— Галоўная цяпер для мяне забарона, — кажа гродзенскі журналіст, — выязджаць за мяжу. За шэсць месяцаў знаходжання ў Жлобіне мне прыйшло звыш дзвюх тысяч лістоў, большасць з-за мяжы: з Польшчы, Чэхіі. Я набыў новых сяброў і хацеў бы ім асабіста падзякаваць. На жаль, пакуль не магу.

— Вялікі дзякуй і нізкі паклон усім, хто нас падтрымаў у час працэсу і ў ссылцы, — гаворыць Мікола Маркевіч. — Калі б свет прамаўчаў пра гэтую бяду, мы замест абмежавання волі, маглі б трапіць у турму, перажыць сапраўднае зняволенне. І быць там да канца тэрміну. Таму ў нас вялікая ўдзячнасць усім людзям, якія спрычыніліся да паслаблення рэжыму нашага ўтрымання.

Абодва журналісты думаюць пра новую газету.

— „Пагоня" была слаўнай старонкай у маім жыцці, — кажа Павел Мажэйка, — і напэўна ў гісторыі Беларусі. Застаўся калектыў, які падтрымліваў нас, чакаў нас. Хочам надалей разам працаваць, ствараць беларускую журналістыку.

— Газета будзе, — не сумняваецца Мікола Маркевіч, нягледзячы на тое, што ўлады дваццаць разоў адмаўлялі ім у рэгістрацыі новага выдання. — Ёсць два дзесяткі чалавек, якія рабілі „Пагоню" і хочуць рэалізаваць вялікі беларускі газетны праект. Новая „Пагоня" мусіць быць хаця б таму, што вялікая частка грамадства патрабуе такой газеты. Сёння ў беларускай інфармацыйнай прасторы ёсць чорная дзірка. З'яўленне такой газеты будзе актам гістарычнай справядлівасці ў адносінах да нацыянальных дэмакратычных сілаў у Беларусі.

— Я асабіста не перажываю, калі нам давядзецца яшчэ гэтага чакаць, — гаворыць Павел Мажэйка. — За час прабывання на хіміі я здабыў чатыры спецыяльнасці: працаваў на лесапільні, быў стропальшчыкам, падмятаў вуліцу і двор, вывозіў гной. У любым выпадку я прынясу карысць і сабе, і беларускаму грамадству.

Як Павел Мажэйка ў Жлобіне, так і Мікола Маркевіч у Асіповічах працаваў фізічна. Дапамагаў будаваць баптысцкі храм. Абодва гавораць, што пераносіць ссылку дапамагала тое, што знайшлі там спагадлівых людзей.

— Пра дрэннае не хочацца памятаць, — кажа Павел Мажэйка, — кожны нармальны чалавек ва ўмовах абмежавання волі адчувае сябе нядобра. Галоўнае, што мне ўдалося не захварэць на страх. Лічу гэта сваёй перамогай. Я гатовы да далейшага жыцця.

Мікола Ваўранюк

Супярэчлівая ідэалогія

Ужо колькі гадоў запар цяперашняя ўлада Беларусі імкнецца стварыць нешта накшталт дзяржаўнай ідэалогіі. Спробы дагэтуль правальваліся і гэта небеспадстаўна — кожны раз „ідэолагі" стараліся не карыстацца нацыянальнай ідэяй, без якой само існаванне беларускай дзяржавы застаецца чымсьці незразумелым.

Напрыканцы сакавіка прэзідэнт А. Лукашэнка зноў загаварыў аб неабходнасці стварэння беларускай дзяржаўнай ідэалогіі. Праўда, з яго выступу перад чыноўнікамі засталіся незразумелымі яе асноўныя пастулаты. Узяўшы пад увагу існуючыя на свеце камуністычную, ліберальную і кансерватыўную ідэалогіі, А. Лукашэнка заклікаў браць з кожнай самае лепшае. Гэта значыць — калектывізм, патрыятызм, сацыяльную справядлівасць ад камуністаў, добразычлівасць, памяркоўнасць, талерантнасць, разважлівасць ад кансерватараў, канкурэнцыю і разлік толькі на сябе ад лібералаў. Пры ўсім гэтым „вінегрэце", ідэалогію, якая існавала ў Савецкім Саюзе беларускі лідэр назваў „нашай беларускай". Што ж тычыцца таго дзяржаўнага ўтварэння, дзе беларусы жылі на працягу сваёй ранейшай гісторыі і якое было калыскай беларускай народнасці, гэта значыць, Вялікае княства Літоўскае, то там, маўляў, беларускай дзяржаўнай ідэалогіі не было. А Беларуская Народная Рэспубліка з-за таго, што была абвешчана, калі ў Беларусі гаспадарылі нямецкія акупанты, не магла пакінуць нават элементаў ідэалогіі. А. Лукашэнка нават заявіў, што БНР была фактычна створаная акупацыйнымі ўладамі. Сапраўдная ж беларуская дзяржаўнасць пачынаецца толькі з БССР. Пры гэтым, чамусьці засталіся па-за прамовай неймаверныя высілкі і намаганні беларускіх патрыётаў XIX — пачатку XX стагоддзяў, вынікам якіх стаў Усебеларускі кангрэс у снежні 1917 года, што быў гвалтоўна разагнаны бальшавікамі. А сама „нацыянальна-буржуазная" БНР, хоць і не была паўнавартаснай дзяржавай, стала асноўнай прычынай абвяшчэння тымі ж бальшавікамі менш за год пазней Савецкай Беларусі. Не ўзгадаў беларускі прэзідэнт пра вялікія дзяржаўна-прававыя здабыткі часоў Вялікага княства Літоўскага, перш за ўсё Статут ВКЛ, які дзейнічаў ажно да 30 гадоў XIX ст. Застаўся па-за прамовай і Францыск Скарына, які ў XVI стагоддзі першым з усходніх славян пераклаў Біблію на мову свайго народа. Казаць аб значэнні рэлігіі для людзей і дзяржаў сярэдневякоўя, мабыць тое ж, што казаць пра значэнне паветра для жывой істоты.

Не адмаўляючы канкурэнцыі і неабходнасці разлічваць кожнаму на сябе, А. Лукашэнка лічыць, што „беларуская ідэалогія павінна мець арыентацыю на традыцыйныя для нашай цывілізацыі каштоўнасці: здольнасць працаваць не толькі дзеля нажывы, але і для дабрабыту грамадства, калектыву, іншых людзей". Здаецца, беларускі прэзідэнт забыўся, з якога грамадства ён паходзіць, калі не памятае з чаго пачалася напрыканцы 80-х гадоў „перабудова". А менавіта ў той час, савецкія кіраўнікі прыйшлі да высновы, што далей заклікі да добрай працы без матэрыяльнага заахвочвання ўжо не дзейнічаюць і пачалі рабіць стаўку на „чалавечы фактар". Што ж тычыцца сацыяльнай абароненасці няздольных ужо ці яшчэ працаваць, то тут мусіць быць асноўны клопат дзяржавы, якая разумнымі падаткамі падахвочвае, а не губіць прыватную ініцыятыву і прадпрымальніцтва — важную складаючую дзяржбюджэту.

Здаецца, адказ на тое, якая мусіць быць беларуская дзяржаўная ідэалогія, калі яна ўвогуле мусіць быць, ляжыць на паверхні — усё што рабілася добрага для Беларусі і ў імя народа Беларусі ў ранейшыя часы павінна ўсхваляцца зараз і мець свой працяг у сучаснасці. На жаль, ідэйныя нашчадкі камуністаў-інтэрнацыяналістаў у сённяшняй беларускай уладзе думаюць па-іншаму, каторы ўжо год ствараючы не зусім зразумелы Саюз Беларусі і Расіі.

А. Лукашэнка кажа, што „ідэалагічную працу рабіць, ствараць, арганізоўваць значна складаней, чым падымаць эканоміку". Не аналізуючы працу кожнай галіны беларускай эканомікі, пакуль нешта не чуваць аб вялікіх дасягненнях нашага „ўсходне-еўрапейскага эканамічнага тыгра", дзе інфляцыя найбольшай з усіх краін-рэспублік былога СССР, а гараджане час ад часу прымушаюцца дапамагаць ледзь дыхаючым калгасам.

Але ўсё гэта, як кажуць, палова бяды. Горш, што з высокай трыбуны заяўляецца аб фактычнай забароне на прафесію для тых, хто мае адрозныя ад прэзідэнцкіх думкі. Пакуль гэта тычыцца выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў. „Калі ты не ўспрымаеш ідэі, якія дэкларуюцца ўладай і прэзідэнтам, не хадзі працаваць у дзяржаўную ВНУ", — заявіў А. Лукашэнка. Прафесіяналізм таго ці іншага выкладчыка, значыць, рэч другасная, бо спачатку ён мусіць „успрыняць" супярэчлівую прэзідэнцкую ідэалогію. А паколькі нават разабрацца ў ёй вельмі цяжка і мала каму ўдалося, то, атрымліваецца, што такому выкладчыку трэба разумець пад дзяржаўнай беларускай ідэалогіяй проста ўсё тое, што кажа А. Лукашэнка. Зусім забыўшы пра Канстытуцыю Беларусі, дзе ў арт. 4 запісана, што „дэмакратыя ў РБ ажыццяўляецца на аснове разнастайнасці палітычных інстытутаў, ідэалогій і поглядаў. Ідэалогія палітычных партый, рэлігійных або іншых грамадскіх аб'яднанняў, сацыяльных груп не можа ўстанаўлівацца ў якасці абавязковай для грамадзян".

Уладзімір Лапцэвіч

Вось і маем бюджэт (бяды)

Падляшскае ваяводства мае ўжо сёлетні бюджэт. Галасамі кааліцыі СЛД-ПСЛ-Самаабароны адпаведная пастанова была прынята на апошняй сесіі Сейміка. Апазіцыя, значыць, Грамадзянская платформа, Права і Справядлівасць (PO-PiS) ды Ліга польскіх сем'яў (LPR), аднагалосна супрацівілася.

Выключна на сход, які здамінавала справа сёлетніх фінансаў, прыйшлі ўсе радныя (трыццацёх). Кааліцыя мае ў ваяводскім сеймику большасць (семнаццаць самаўраднікаў), дык заранёў можна было спадзявацца, што бюджэтная пастанова будзе прынята. На працягу месяца ад першага чытання пастановы да яе прыняцця ваяводская ўправа прыняла пад увагу некаторыя, хоць асноўныя, прапановы апазіцыі. Між іншым, таму дайшло да дзвюх асноўных змен. Культурныя ўстановы, якія падлягаюць ваяводскаму самаўраду, атрымалі 600 тыс. зл. больш, што дазволіць ім неяк дзейнічаць. Па 150 тыс. зл. больш атрымалі беластоцкія Філармонія і Драматычны тэатр, а па 100 тыс. зл. — Ваяводская бібліятэка і Падляшскі музей. Ваяводскаму асяродку анімацыі культуры 20 тыс. зл. запісалі на агульнапольскую прэзентацыю культуры нацыянальных меншасцей у Мельніку. Меншасці (але не толькі яны) могуць таксама старацца атрымаць грошы на арганізацыю мерапрыемстваў, выданні і г.д., з двухмільённай пулькі з рэзерва на культурныя мерапрыемствы. Грошы на культуру знайшліся ў г.зв. еўрасаюзнай пульцы, значыць, у частцы прадбачваных, а раней у праекце бюджэту свядома перабольшаных, выдаткаў на м.інш. арганізацыю ваяводскіх структур звязаных з уваходам Польшчы ў Еўрасаюз (з самага пачатку было 1 млн. 700 тыс. зл.).

Другая важная змена ў параўнанні да першага праекта бюджэту („Ніва" н-р 11 ад 16 сакавіка) датычыць дарог. Грошы якія пачаткова прызначаліся на г.зв. інвестыцыйныя закупкі (аўто, камп'ютэры і г.д.) былі перасунуты ўправай на бягучую мадэрнізацыю і пабудову дарог. На жаль, пабольшылі пульку на гэтую мэту толькі на 95 тыс. зл. Аднак, што найважнейшае, управа рашыла радыкальна паменшыць, зробленую правымі папярэднікамі, шматмільённую задоўжанасць ваяводства, найбольшую з цэлае шаснаццаткі польскіх ваяводстваў. Як прызналася ў размове з „Нівай" генеральны дырэктар Падляшскай маршалкоўскай управы, калі б гэта не збылося, Падляшша на недалёкім гарызонце чакала б банкруцтва. На Падляшшы доўг і яго абслугоўванне гэта больш за 12 адсоткаў усяго бюджэту. Дапушчальная мяжа вызначаецца на ўзроўні 15%. Выхад вышэй гэтага ўзроўню быў бы канцом фінансаздольнасці рэгіёна. Для параўнання, апошняе перад Падляшшам найбольш задоўжанае ваяводства мае абавязацельствы на ўзроўні 5%. Адна суцеха, што на працягу года можна спадзявацца дадатковых грошай з пулькі ЕС і з рэзерваў дзяржавы (уласныя даходы ваяводства гэта, згодна з законам аб самаўрадзе, ледзь каля 8%).

У час сесіі Сейміка, вядома, апазіцыя выкарыстала свае правы на крытыку бюджэту.

— Гэта бюджэт не развою, але спажывецкі і застою, — гаварылі радныя ад LPR. — Апіраецца ён на ўяўныя сродкі з Еўрасаюза.

Радны PO-PiS Цэзары Цеслюкоўскі пералічыў пяць прычын, для якіх ягоны клуб быў супраць бюджэтнай пастанове.

— Нашым становішчам супрацілялемся фінансавай палітыцы ўрада ў адносінах да самаўрадаў, — падкрэсліваў ён у першую чаргу. — Сумы субвенцыі і датацыі з цэнтральнага бюджэту не дасягаюць нават мінулагодняга ўзроўню.

Кааліцыя спрабавалася абараняцца:

— Маем невялікі ўплыў на ваяводскія даходы, — тлумачыўся Ян Нэтэр з СЛД.

— Сам бюджэт — сціплы і не з'яўляецца ён пераломным, але карысна адрозніваецца хоць бы спосабам яго ўзнікнення, — сказаў віцэ-старшыня Сейміка Адам Дабронскі з ПСЛ, спасылаючыся на выслухванне прапаноў апазіцыі наконт яго кшталту.

Цішыня ўсталявалася, калі на трыбуну выйшаў кааліцыянт СЛД і ПСЛ з „Самаабароны" Ян Камінскі. Голас гэтага (як у Сейме ды іншых ваяводствах непрадказальнага) клуба мог быць вырашальным аб лёсах бюджэту, а яго непрыняццё азначала б увядзеннне камісарскай управы. Кааліцыянты, аднак, уздыхнулі з палёгкай, калі радны Камінскі падтрымаў рашэнне. І поўная палёгка ў іх радах наступіла, калі ён сказаў:

— Не бачым сёння ніякай іншай каліцыі за тую, у якой знаходзімся.

У падобным тоне раней выказаўся Адам Дабронскі:

— Абавязвае нас лаяльнасць.

У ПСЛ ёсць адзін віцэ-маршалак.

У апошняй прамове маршалак Януш Кшыжэўскі згадзіўся з апазіцыяй. Наконт сціпласці ўзмацнення ваяводскіх бюджэтаў грашыма з дзяржаўнага бюджэту. Заклікаў стварыць дзеля рашэння гэтага пытання звышпартыйнае лобі. Выказаў надзею, што адпаведныя змены наступяць у рамках рэформы публічных фінансаў, якую рыхтуе ўрад.

Шмат эмоцый у час апошняй сесіі выклікаў працяг атакаў LPR на Цэнтр мастацтваў, культур і народаў „Пагранічча" ў Сейнах. На думку гэтага клуба, вядзе ён антыпольскую дзейнасць, а яго Фонд, у якім працуюць тыя ж людзі што ў Цэнтры, выдаюць грамадска шкодныя публікацыі. Гаворка пра „Суседзяў" Тамаша Гроса, кнігу прысвечаную спаленню ядвабненскіх яўрэяў, здзейсненаму пры актыўным удзеле мясцовых палякаў. LPR пачаткова дамагалася адняць напалову (200 тыс. зл.) датацыю на дзейнасць „Пагранічча" і ліквідацыі завялікага, на яе думку, ліку штатаў (14 з паловай). Супрацілялася таксама завысокім заробкам тамашніх працаўнікоў (у сярэднім больш за 1 800 зл.)

— Снуецца тут смуродная нотка антысемітызму! — абагульніў у размове з журналістамі ідэі LPR шэф клуба СЛД Збігнеў Кшывіцкі, старшыня Сейміка.

Прапановы фінансавых скарачэнняў „Пагранічча" канчаткова галасамі кааліцыі ўпалі. Аднак, радныя Лігі не думалі застацца ў пройгрышы і дамагаюцца стварыць часовую камісію (па ўзоры сеймавай следчай) у справе даследавання дзейнасці сейненскага Цэнтра, і гэта незалежна ад таго, што ў „Пагранічча" працягваецца кантроль Найвышэйшай кантрольнай палаты і маршалкоўскай вертыкалі.

— Ёсць такая бяда, што мусім ратаваць самае каштоўнае дабро нашай культуры, — сцвердзіў наконт атакі на „Пагранічча" Збігнеў Кшывіцкі.

Мацей Халадоўскі

Першы ў ваяводстве

[1 ☞ працяг]

руктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі 5 жніўня перад самым канцом працоўнага дня.

— Едучы ў Беласток натрапіў я яшчэ на рамонт дарогі і давялося доўга чакаць, каб праехаць. Аднак паспеў, — кажа Ян Бусловіч.

Пасля толькі даведаўся ён, што спешка з падрыхтоўкай дакументаў спрычынілася да таго, што стаў першым гаспадаром у Падляшскім ваяводстве, які выступіў за дапамогай з праграмы „SAPARD". Праз некалькі тыдняў прыехалі візітатары праверыць ці гаспадарка адпавядае еўрасаюзным патрабаванням. У аборы дастаткова было месца для быдла, а ўмяшчальнікі на вадкі гной былі намнога большымі чым павінны. Адзінай інвестыцыяй, якую давялося паправіць, была бетонная плошча побач аборы пад гной у цвёрдым стане. Трэба было яе павялічыць на 100 квадратных метраў, каб гной мог даўжэй ляжаць перад вывазам на поле. Дамова заключана была на куплю трох машын і прадбачвала кампенсацыю гаспадару паловы выдаткаваных на гэтую мэту грошай.

— Пасля стаў я тэлефанаваць да прадуцэнтаў гэтых машын і нават хацеў ехаць на Сельскагаспадарчы кірмаш ў Познань, каб выбраць машыны прыдатныя ў маёй гаспадарцы. Канчаткова вырашыў памяняць куплю прычэпы прыстасаванай для збірання вялікіх кіпаў сена і саломы з поля на звычайную прычэпу, — гаворыць Ян Бусловіч. Традыцыйная прычэпа павінна быць больш трывалай і універсальнай. Прадстаўнікі бюро праграмы „SAPARD" згадзіліся на змену. За крэдыт і ўласныя сродкі купіў машыны польскай вытворчасці. У студзені адбылася праверка машын працаўнікамі беластоцкага бюро і 25 лютага вярнулі Яну Бусловічу 33 900 злотых, згодна з дамовай. У выпадку рэструктурызацыі вытворчасці малака можна было выступаць за дапамогай размерам да 85 тысяч злотых.

— Гэта ж канкрэтная дапамога. Я намаўляю кожнага пакарыстацца сродкамі фонду „SAPARD", калі хто гаспадарыць згодна з еўрапейскімі нормамі, — дадае спадар Ян.

Ян Бусловіч самастойна займаецца на гаспадарцы ад 17 года жыцця. Тады памёр бацька і спадар Ян стаў адзіным карміцелем сям'і. Завочна закончыў Сельскагаспадарчы тэхнікум у Бельску-Падляшскім і распачаў разбудоўваць бацькаўскую гаспадарку. Спачатку было 13 гектараў зямлі і 5 кароў. Гаспадарку пачалі спецыялізаваць у жывёлагадоўлі ў 1995 годзе. 14 кароў трымалі ў старой аборы, а ялаўкі — у будынках суседзяў. Новую абору на 26 кароў збудавалі ў 1999 годзе, а ў старым будынку пачалі трымаць ялаўняк. Ад 20 гадоў каровы знаходзяцца пад наглядам заатэхніка, які ацэньвае іх малочнасць. Шляхам крыжавання пародаў Ян Бусловіч дайшоў да таго, што яго каровы чорна-белай пароды сталі ў 80% гольштэйн-фрызійскай пароды. Змена пароды, корму і спосабаў жывёлагадоўлі спрычынілася да паляпшэння малочнасці кароў. У 2001 годзе каровы спадара Яна аказаліся самымі малочнымі ў Бельскім павеце. У сярэднім надаіў ён па 6 146 літраў малака за год ад кожнай каровы (разам 153 831 літр). У 2002 годзе малочнасць павялічылася да 6 700 літраў малака ад каровы. Каб гадаваць большую колькасць кароў трэба было дакупіць зямлю. Зараз у Яна Бусловіча 36 гектараў і каля 50 штук быдла. На полі найбольш травы, многа кукурузы і каля 10 гектараў збожжа. Усю расліннную прадукцыю выкарыстоўвае на корм для быдла. У гаспадарцы 3 трактары і разнародныя машыны. Зараз сплачвае крэдыты, якія ўзяў на будову аборы і куплю трактара маркі „Зетар".

— Маю надзею, што будзе пераемца маёй гаспадаркі. Хаця адна дачка вучыцца ў вышэйшай навучальнай установе ў Данії, то другая на Сельскагаспадарчым аддзяленні Політэхнічнага інстытута ў Беластоку, — кажа Ян Бусловіч.

Аляксей Мароз

У Еўропе аднолькавых шанцаў

У рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў" друкуем чарговы тэкст з цыкла 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. Да артыкула прыкладзена конкурснае пытанне. Аўтары правільных адказаў возьмуць удзел у штотыднёвай жараб'ёўцы трох кніжных узнагарод, а на канец праекта — галоўнага прызу: набору дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Спонсарам праекта з'яўляецца Управа Камітэта еўрапейскай інтэграцыі.

Projekt wydawniczy zrealizowano przy współpracy z Urzędem Komitetu Integracji Europejskiej w ramach konkursu otwartego dla mediów-2003.

4 конкурснае пытанне

Колькі грошай у год атрымоўвае Польшча ад Еўрапейскага Саюза ў рамках праграмы „SAPARD"?

Адказ: .....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

Імя і прозвішча: .....

Адрас: .....

(Каб правільна адказаць на пытанне трэба ўважліва прачытаць надрукаваны побач артыкул. Адказы просім дасылаць на гэтым талоне на адрас рэдакцыі. Тэрмін дасылання адказаў — да 20 красавіка 2003 г.)

Узнагароды...

... за правільны адказ на *1-ае конкурснае пытанне* атрымоўваюць: **Анна Аляксюк** з Бельска-Падляшскага, **Паўліна Іванюк** з Малінніка і **Барбара Якубюк** з Гайнаўкі. Узнагароды дашлем па пошце.

http://www.army-technology.com/

Агрэсія, якую завуць вызваленнем

Кожнага дня па ўсіх каналах тэлебачання можна глядзець як рэалізуецца „вызваленчая" місія амерыканскіх, брытанскіх, аўстралійскіх і польскіх войскаў у Іраку. Самалёты, бомбы, танкі, агонь і руіны прынеслі ў Ірак нікім там не чаканыя „вызваліцелі". Польшча, парушаючы канстытуцыю дзяржавы, таксама паслала свае войскі, хаця мала хто ў краіне разумее дзеля якіх прычын палякі маюць забіваць іракцаў. Амерыканскія палітыкі хваляць палякаў за ахвярнасць у вайне з Іракам. У тэлебачанні і газетах паказвалі здымак як салдаты спецатрада „ГРОМ" трымаюць іракца з выкрутымі рукамі і перадаюць яго амерыканцам. Відаць, што салдаты ганарацца сваімі паводзінамі. Можна здагадацца, што для таго арабскага ваеннапалоннага баевікі, якія прымусілі яго стаяць у прыніжальнай позе таксама не бачыліся як „вызваліцелі". Тым часам гэтак званы дэмакратычны свет абураецца тым, што іракскае тэлебачанне паказала перапалоханых амерыканскіх ваеннапалонных, называючы гэты факт парушэннем міжнароднага заканадаўства.

Паводле прыгнятальнай большасці польскіх журналістаў, палітыкаў і вайсковых каментатараў салдаты ў Іраку змагаюцца за вызваленне арабаў ад дыктатара Садама Гусейна. Прэзідэнт Ірака — вядома, злачынца, але такіх як ён у свеце дзесяткі, а некаторыя карыстаюцца падтрымкай амерыканскіх улад. „Вызваленыя" амерыканцамі іракцы амаль кожнага дня перад камерамі і мікрафонамі замежных сродкаў масавай інфармацыі паўтараюць: „Не хочам вас тут бачыць, вы — акупанты і агрэсары", каментатары, аднак, маньякальна паўтараюць пра тое, якім жахлівым дыктатарам з'яўляецца Гусейн і якія злачынствы былі ім учынены. Выглядае на тое, што ракеты і бомбы маюць быць іракцам ластаўкамі свабоды.

Раней, у час падрыхтоўкі да вайны, яе неабходнасць тлумачылі патрэбай раззбраення Гусейна, хаця міжнародная камісія не знайшла на тэрыторыі Ірака ніякай зброі масавага знішчэння. Пасля сталі пагаварваць пра ігнараванне Іракам пастаноў ААН. Заяўляюць аб гэтым тыя, хто заатакаваў краіну без згоды ААН. Калі пачалася вайна, аб'явілі вызваленчую місію і, кідаючы бомбы на гарады, заядла паўтараюць пра патрэбу адбудовы Ірака. Слухаючы каментарыяў, можа скласціся ўражанне, што ідзе трансляцыя з псіхіятрычнай клінікі, дзе мікрафоны дасталіся цяжка хворым шызафрэнікам. Тлумачаць яны гледачам, што таму кідаюць бомбы на гарады, каб была магчымасць іх адбудовы. Нармальны чалавек ставіць сабе пытанне, чаму так яны хочуць адбудоўваць той Ірак. Напрыклад, у Польшчы пасля зімы амаль перасталі існаваць дарогі і чаму іх не адбудоўваць, калі з'явілася такая неадольная ахвота будаваць? У выпадку Ірака можна здагадвацца, што пад словам „адбудова" нешта скрываецца, некаторыя гавораць, што прага рабунку тамашняй сыравіны. На працягу кароткага часу ўсе аргументы, якія ставіліся ў апраўданне вайны, поўнасцю акампраметаваліся.

Арабы абараняюць сваю зямлю і шмат паказвае на тое, што гэтая вайна не закончыцца праз некалькі тыдняў. Так як ізраільская, найлепш у свеце ўзброеная армія, не можа справіцца з палесцінскімі хлопцамі з камянямі ў руках, так амерыканцы з саюзнікамі не ў змозе хутка „вызваліць" Ірак. Могуць толькі бессэнсоўна забіваць, без спадзеву на дасягненне мэты. Ірак нават без Садама будзе антыамерыканскі, таму што сотні тысяч людзей патрацяць сваякоў, дзесяткі тысяч — маёмасць. З другога боку, амерыканцы не могуць спыніць гэтай вайны, бо абазначала б гэта кампраметацыю іхняй імперыі, ніхто больш усур'ёз не ўспрымаў бы ніякіх пагроз з боку Буша, ці тых, якія ў будучыні зоймуць яго месца. Таму бессаромная, хлуслівая ваенная прапаганда будзе нас пераконваць у неабходнасці змагання за вялікія ідэі — свабоду і дэмакратыю. Уся надзея ў амерыканскім грамадстве, якое можа патраціць ваенны энтузіязм, калі першых „хлопцаў" прывязуць у чорных мяхах. Падчас в'етнамскай вайны доўгімі гадамі грамадства змагалася за яе спыненне. Сёння, калі ваенная і нафтаперапрацоўчая прамысловасць знайшлі ў вайне крыніцы свайго фінансавання, зробяць усё, каб яна хутка не закончылася. Амерыканская прапаганда, нахабная як раней савецкая, прыдумвае новыя аргументы, якія будуць апраўдваць „інтэрнацыяналістычную дапамогу" іракскаму народу.

У Польшчы вайну супраць Ірака падтрымлівае большасць палітыкаў і меншасць грамадства. Аднак пратэставаць супраць агрэсіі „вялікага брата" на Ірак выходзіць толькі пару соцень маладых чалавек. Хаця самы вялікі маральны аўтарытэт — папа рымскі — выказаўся, як сапраўдны хрысціянін, супраць вайны, мала хто з богапаслухмяных палітыкаў над Віслай падзяляе яго пункт гледжання. Прыхільнікі вайны — большасць палітычных элітаў — атаку на далёкі арабскі край называюць выкананнем волі міжнароднай супольнасці. Некаторыя з сучасных энтузіястаў вайны савецкую агрэсію на Афганістан у 1988 г. таксама бачылі як выкананне волі „сусветнага пралетарыята", ці „прагрэсіўнага чалавецтва". Яны нічуць не памянялі сваіх поглядаў — гэта „вялікі брат" у іх памяняўся.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Паблытаныя рахункі

Зайшоў я ў сваю любімую краму, у якой, па прычыне галоўным чынам недахопу грошай, у апошні час я не бываў. Прадаўшчыца прывітала мяне незвычайна ветліва, хоць без энтузіязму, як дагэтуль. Збянтэжаны, спрабаваў я пачаць гамонку. „Ну, і маем вайну", — бабахнуў. Прадаўшчыца глянула мне глыбока ў вочы, і з тугою прамовіла: „Пане Мацек, а што мне да Ірака! У мяне свае клопаты. Учора мне газ адключылі". У краме апрача нас нікога больш не было. Гандлярка прысела ля прылаўка і пачала сваю споведзь, быццам перад сваёй блізкай і вернай сяброўкай.

— Ведаеце, пасля смерці майго мужа ў другой палове мінулага года не мела я галавы да нічога. Дзесьці падзеўся чэрвеньскі рахунак за газ. Я і так усё старалася аплачваць рэгулярна. А, вось, аднойчы прыйшлі два паны з газавага завода, паказалі, што за чэрвень я не заплаціла, і адрэзалі газаметр. Не паведамілі мне раней, што ў мяне нядоімка. Я прынамсі не памятаю.

Прадаўшчыца вяла свой аповед аб бяссільнасці амаль са слязамі ў вачах. Пасля адключэння газу зараз жа паехала ў газоўню, заплаціла няшчасныя 32 злотых. Не мела ўжо, аднак... 116 зл. за новае падключэнне, чаго патрабаваў газавы завод. Мусіць, вось, чакаць зарплаты і ўшчыкнуць тую суму ад грошай, прызначаных на месячнае ўтрыманне дому.

Я купіў што трэба і пачаў задумоўвацца, адкуль газавы завод выдумаў якраз такую суму за „маніпуляцыю" пры газе маёй знаёмай прадаўшчыцы. З цікаўнасці паехаў я на беластоцкую вуліцу Зацішша, па якой прадпрыемства мае сваю рэзідэнцыю (слова вельмі дарэчы). Адзін з работнікаў патлумачыў мне, што такую стаўку акрэсліў міністр гаспадаркі, у ёй больш за 50 злотых гэта даезд да кліента, а рэшта — вартасць працы наёмнага рабочага. Як бы ты не лічыў за таксі з даездам на месца пражывання прадаўшчыцы і назад, не заплаціла б яна паўсотні. Падключэнне і адрэзанне газу, як я зарыентаваўся, агулам працягваецца паўгадзіны. Пакажыце мне фірму, якая плаціць за гадзіну працы 60 злотых! Тут трэба дадаць, што, незалежна ад тых аплат, даўжніца заплаціла карныя адсоткі за нядоімку (2,36 зл.).

Вядома, не мае значэння для Газавага завода, што рахунак кліенту кудысьці падзеўся, наступныя былі ўсе аплачаныя, а напамінку не было або таксама дзесьці прапаў. Усё гэта не праблема газоўні. Дарэчы, чаму гэтая фірма не высылае напамінкаў заказным лістом? Пры нагодзе я даведаўся, што калі ўласнік кватэры памёр, а спадчыннік пражываючы ў ёй у той час вядзе ў судзе спадчынны працэс і толькі пасля справы зможа вырашаць фармальнасці з жыллёвым кааператывам, каб стаць галоўным кватэранаймальнікам (што можа працягвацца пару тыдняў або і месяцаў), газавы завод можа адключыць у той час газ. Таму што разам са смерцю ўласніка кватэры траціць сілу дамова, якую ён заключыў з газоўняй, а наступнай, па прычыне незавяршэння судовай справы і неафармлення яе ў кааператыве, нельга заключыць. У выніку за адключэнне і новае падключэнне газаметра таксама трэба будзе заплаціць тыя 116 злотых. А далей: калі газаметр, які памешчаны не ў кватэры, а на лесвічнай клетцы, хтосьці папсуе, дык і мы заплацім за гэта. Тэарэтычна трэба было б паставіць перад газаметрамі вартаўніка!

У той самы час, калі я займаўся высвятленнем газавага пытання, у гэты раз мне прыслалі чарговы паўгадовы рахунак з Энергетычнага завода. За сакавік патрабавалі падвойную заплату. У першыя дні месяца гэта было больш за 70 зл., у апошнія — больш за 40. Спалоханы гісторыяй маёй знаёмай прадаўшчыцы, папёр я ў банк (які не бярэ камісійных) і заплаціў абодва — той падвойны і наступны-задаткавы, налічаны абстрактна. Пасля штосьці мне не давала спакою і пазваніў я энергетыкам. Ветлівая пані вельмі здзівілася, што я заплаціў першы сакавіцкі рахунак, бо павінен толькі другі. Першы быў „задаткавы", авансам — завысокі. Вядома, не трэба будзе плаціць наступныя паўтара месяца за электраэнергію. На маё пытанне, чаму ніхто з Энергетычнага завода не паінфармаваў мяне, што сапраўды мне трэба плаціць, пані далей нястомна ветліва працягвала:

— Хтосьці мусіў званіць нам у гэтай справе.

Я ведаю, што ніхто ад мяне ім не званіў, бо жыву адзін і толькі я ведаю, якія рахункі мне прыходзяць і ведаю ж, званіў я ці не.

Пасля таго вопыту стаў я салідарызавацца з газавай праблемай маёй знаёмай прадаўшчыцы. Зразумеў, што маё ўступнае слова ў гаворцы пра вайну ў Іраку гучала абстрактна. Фактычныя праблемы гэта тыя, што кранаюць нас непасрэдна: тут і цяпер. Найчасцей звязаныя з бядой, нястачай і паўсюднай насцярожанасцю, адкуль можа надысці неспадзяваная жыццёвая агрэсія („газавая", „электраэнергетычная"?). Што будзе ў найбліжэйшыя гады пасля заканчэння вайны? Гэта пытанне пачало мяне менш цікавіць чым тое, напрыклад, як пры сённяшнім блізка стотысячным беспрацоўі на Падляшшы — у найбліжэйшыя сем гадоў будуць ствараца неабходныя 60-70 тысяч новых месц працы. У гэты час у вытворчы ўзрост у нашым рэгіёне мае ўвайсці каля 211 тысяч людзей. Вайной у Іраку ў сапраўднасці магу на штодзень пераймацца настолькі, наколькі ўплывае яна на спознены прылёт буслоў на Падляшша. А так сталася, як сцвярджае вядомы беластоцкі арнітолаг Дарак Ахрымюк родам са Збуча.

Мацей Халадоўскі

Літаратурна-мастацкая старонка № 516

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

За шведскім юбілейным сталом

Адкасілі дзве касы (77) якіх так баяўся вядомы ўсім нам Віктар Швед, дык абясшкодзіў іх... вершам. А ў гэтым годзе, у 78 гадавіну паэта з Мора, 23 сакавіка, святкавалі мы ўсім кагалам — старыя і малыя беларусы, чыноўнікі з абодвух бакоў мяжы прыпаднеслі вялікія букеты і словы падзякі ад чытацкага народу — усё гэта адбылося ў паўнюткай зале Цэнтра праваслаўнай культуры ў Беластоку. Афіцыйнае змястоўнае мерапрыемства працягвалася дзве і паўгадзіны, у тэмпе хуткім. Вучаніцы Аліны Ваўранюк Кацярына Юшчук і Наталля Швед вялі праграму паводле адмысловага сцэнарыя — вершы ў выкананні іх калег з ПШ н-р 4 у Беластоку і вучняў беластоцкага беларускага садка н-р 14 перапляталіся песнямі — рэлігійнымі і на словы Юбіляра (выдатна апрацаваў Шведаву „Каляду" спадар Раман Зубрыцкі, які вядзе дзіцячы хор „Галілея" пры царкве Прамудрасці Божай у Беластоку), і новымі творамі Юбіляра пад музыку Генадзя Шэмета ў выкананні Франка ды Янка Шэметаў і Наты Швед... Слухачы, якіх шмат прыходзіць на мерапрыемствы ў Цэнтр праваслаўнай культуры, а тут было іх намнога больш — дайшла яшчэ вялікая частка са святкаванняў 25 Сакавіка (дарэчы — знаёмыя ўсе твары!), былі проста ашаломлены такім хуткаплынным ды змястоўным аглядам творчасці Юбіляра, тэмпераментам выступоўцаў, нават і навуковай акрасай (агляд творчасці Шведа паводле Ірэны Максімюк). Такіх бойкіх і дасканалых вядучых Касі і Наты могуць пазайздросціць найлепшыя беларускія тэле- ці радыёпраграмы. І гэта дае вялікую радасць і надзею — і аўтару, і чытачам; дзеткі выступалі з вершамі, якія самі сабе выбралі, якія ім проста спадабаліся, захапілі, рассмяшылі, давялі да одуму... Значыць, паэт Віктар Швед — аўтар не аднаго пакалення. І дзядоў, і дзяцей, і ўнукаў, а нават і праўнукаў! І хай сабе думаюць некаторыя „велькія творцы", якім здаецца, што класічны верш даўно ў нябыце па прычыне сваёй несучаснасці і сучаснаму паэту проста не выпадае пісаць „як калісь". Цікава, пра што яны пішуць? — папытайце ў іхняга чытача!

Віктар Швед надрукаваў на старонках „Нівы" каля дзвюх тысяч вершаў. І для дзяцей, і для дарослых. Выслухалі мы на сустрэчы ў ягоным выкананні нашых улюбёных, напрыклад, „Варыць бульбу бабулька", таксама і новых. Праўда, апошнія нейкія сумнаватыя былі... Час такі. Але падрастае новае пакаленне, і расце ж Ната, тата!

Усе мы, хто вучыўся нашай мовы з Вашых вершаў, жадаем Вам, шаноўны Віктар Швед, перш за ўсё — добрага здароўя. Будзе яно — будзе ўсмешка, радасць-уцеха ды натхненне!

Міра Лукша

Міра Лукша

Клімент

Дзед Клімент, засунуўшы вялікія пальцы абедзвюх рук за рэмень, глядзеў на свае прыгожыя новыя ізраільскія дзверы да свае кватэры. Моцныя, якія абы-хто не ўзломіць. Каштавалі! Каб не Анелька, дык не меў бы такіх. Дачка. Добрая дачка. Сын Мікола — як не ў арышце, дык у турме — не ўдаўся. А аднолькава ж выхоўвалі яны, Клімент і Мар'янна, сваіх дзяцей. Мабыць, больш паблажалі Міколу, асабліва бацька — заўжды ж марыў мець сына, і Бог ім даў яго тады, калі ўжо надзеі не мелі. Галубілі, песцілі, а адбіўся ад рук — і пайшоў у сабачую скуру. Але, так папраўдзе, дык і нядрэнны хлопец. Толькі капманія кепская цягне да сябе. А часу мае зашмат. А калі б працу меў Мікола, дык і час свой праводзіў бы больш талкова... За таго сына дык усё зводзяцца суседзі — недалёка ж можа яблычак ад яблыні пакаціцца, праўда ці не? І пашану страціш у вачах людзей. Прыйдзе Мікола, сіднем сядзіць у хаце, калі не п'е, сварыцца. І матку да гібелі давёў — даходзіць у госпісе. Ад згрызоты рак заеўся, еў, еў і даеў. Добра, што Анелька там валанцёрка, дык і матку, не горш іншых, даглядае. Там дбаюць пра хворых, толькі ж цяжка ўміраць, на чужым месцы, дзе наўкол чужыя людзі, хоць і глядзяць няблага...

Па белых гладкіх дзвярах спаўзаюць свежаразбітыя курыныя яйкі. От засранцы! Са школы прыбеглі, набралі яек з халадзільнікаў, ляснулі дзеду ў дзверы, і пабеглі назад у школу. Блізка яна. Не раз лавіў дзед за каўнер серуноў. Хадзіла Анелька да дырэктара школы, што старэчы, а яму ўжо 92 гады, вучні дапякаюць. Балкон на першым паверсе камянямі абкідваюць, яйкамі шпараць у дзверы. Дзед пражыў не адну вайну і не ад добрага ў яго такая сівая барада! Схапіў аднаго хлопца старэча, зграбастаў, завёў нават на шосты паверх, бацьку шпурнуў пад нос: глядзі, каго ты выхаваў! Вырываўся малы, ды не ўцёк. Ды бацька падшпарка шпарнуў старому ў вочы: „Выхоўвайце свайго сына! А будзеце дакучаць малым, дык у паліцыю трапіце!" Сынок, схаваўшыся за бацьку, вывесіў язык: будзе табе такое!

Усе, хто заходзіць на першы паверх, а заходзяць жыхары ўсяго блока, бо вісяць тут паштовыя скрынкі, моўчкі ўзіраюцца на запэцканыя дзверы. Абмінаюць і слізкую жоўтую калюжыну пад дзвярыма кватэры з прыгожым, срэбным нумарам пяць. Стараюцца не глядзець на прыгорбленага барадача, які патрабавальна пазірае ім у вочы.

Толькі адна асоба заступілася. За шыварат злавіла аднаго смургеля, за стрыжаныя кудлы.

Каля дзвярэй гэтай суседкі стаў красавацца, выведзены крывулямі, надпіс: „Насця гэта х...".

Андрэй Грайка

Дарагому Віктару Шведу

Галава Твая спакойна,
Ты ж у нас цяпер дастойны.
Плывуць вершы так гурбою,
Як сена дзьмутае трубою.

Час плыве даволі хутка,
Дык трымайся яшчэ прутка!
Маеш Ты цяпер задачу —
Дачакацца яшчэ зяця.

Цяжка здзейсніць, скажу прама,
Каб Натальку выдаць замуж.
Гэта ўжо зусім не проста,
Трэба жыць год дзевяноста.

Табе гэтага жадаю,
Хіба сам не дачакаю,
Каб дажыць — было б прыемна,
Мы ж з Табой раслі ўзаемна.

Твае вершы ўсе з натхненнем
Чытаць будуць пакаленні,
Вывучаць у вершах веды
І ўспамінаць Віктара Шведа.

Віктар Швед

Мёртвая чыгунка

За царскіх часоў збудавалі чыгунку,
Штодзённа хадзілі сюдой цягнікі.
Палепшыліся наваколля варункі,
Паехалі ў горад мае землякі.

Ды толькі ў ваенны год сорак чацвёрты,
Калі разгарэўся бязлітасны бой,
Фашысты чыгунку аставілі мёртвай,
Разбурылі цалкам усё за сабой.

І трэба было шмат напружанай працы,
Каб мы дачакаліся лепшых умоў,
Каб наша жыццё зноў магло аднаўляцца,
Каб ездзіць у горад маглі мы ізноў.

У Гайнаўку, Бельск землякі пастаянна
Ездзілі з поваду розных падзей.
Ля Мора яны збудавалі паўстанак,
У горад даехаць было каб лягчэй.

Дзяржаўныя ўлады спыніць захацелі
У Гайнаўку з Бельска ўсе цягнікі.
Чыгунка зусім зарасла пустазеллем,
Не ездзяць ужо цягнікам землякі.

Ураўнілаўка

Кусты, кусты,
Вы гарадоў прыгожасць!
Быццам платы,
Жывая агароджа.

Часта з вясны
Кусты прывабы поўны,
Растуць яны
Свабодна і няроўна.

Летняй парой
Такі парадак звычны:
Кусты пілой
Раўняюць электрычнай.

Тварцы ідэй
Аб раўнаванні дбайных —
Раўняць людзей
Хацелі б незвычайных.

Размова з дачкой

Дванаццаць споўнілася Наце,
Гадкоў ёй хочацца мець болей.
— Калі ж мне стукне васемнаццаць? —
Час нам мінае так паволі.

— Гэта ілюзія, дачуся,
Што выступае ў маладосці.
На пройдзены шлях азірнуся —
Знаю, што на Зямлі мы госці.

Час так маланкава ўцякае
І нам крадзе гады заўзята.
Я ўжо нікога не пытаю,
Калі пачну васьмідзесяты.

Зорка

старонка для дзяцей

Фота АЛЯКСАНДРА МАКСІМЮКА

Бельскія гімназісты ў рэдакцыі „Нівы”

Бельскія гімназісты ў „Ніве”

20 сакавіка г.г. рэдакцыю „Нівы” наведалі бельскія гімназісты і настаўніцы беларускай мовы — Валянціна Бабулевіч і Міраслава Маркевіч.

Сярод гімназістаў былі вучні розных класаў.

— Прыехалі толькі выдатнікі, — адзначыла Валянціна Бабулевіч.

— Наша экскурсія гэта ўзнагарода выдатнікам па беларускай мове. Тут ёсць лаўрэаты прадметных і мастацкіх конкурсаў, найлепшыя вучні па беларускай мове.

Галоўны рэдактар „Нівы” Віталь Луба расказаў пра працэс падрыхтоўкі тыднёвіка. Пра конкурсы і цікавіны з нашага панадворка. У якасці падарунка нашы госці атрымалі кніжку Георгія Валкавыцкага „Ашчэпкі”.

Раней бельская моладзь наведала выстаўку мастацкіх прац Пётры Сергіевіча ў музеі Альфонса Карнага ў Беластоку. (гак)

Польска-беларуская крыжаванка № 15

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 11: Самавар, вынік, бор, нагода, мох, навар, сок, харт, парашутыст. Мода, сынок, манах, міг, душ, закон, дых, забава, курорт.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Магдаліна Кавэцкая** і **Эвеліна Бяроза** з Орлі, **Лукаш Гайдук** з Нарвы, **Агата Балтрамюк** з Дубін, **Анна Хількевіч** з Бельска-Падляшскага, **Пётр Герасімюк** з Арэшкава, **Кацярына Калішук**, **Альжбета Прычыніч** і **Матэвуш Тамашук** з Новага Корніна. Віншуем!

Авяр'ян Дзеружынскі

Шпакі-дружбакі

Шпакі-дружбакі,
Летуны,
Певуны,
Разам
Кормяцца яны
На лужку-лужочку,
Што каля садочку.
Тут знаходзяць
Чарвякоў,
Розных
Шкоднікаў жукоў.
Іх смакуюць
І гуляюць,
Дружна песенькі
Спяваюць...
А на яблыньцы
Ў садку
Падпявае
Шпак шпаку.
Удваіх
Ды і ўтраіх
Свішчуць дружна,
Лашчаць слых.
Працавітыя
Шпакі
І на спевы
Мастакі.

Вясна

Прыйдзе вясна
Цёплая пара
Прыляціць шпак
Выпаўзе рак
Закрэхчуць жабы
Пакажуцца крабы
Бусел гняздо збудуе
Або адрамантуе
Салавейка весела заспявае
Вясну прывітае

Раман Лушчынскі, VI „б” кл.
ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Дзённік Міколы

Наша камяніца

Цяпер раскажу пра ўратаванне нашай камяніцы. Памятаеце, як спадарыня Клемянціна бяздумна падпісвала ўсе лістоўкі і дакументы?

Пасля ўрокаў я наведаў Нор Узі. Мастак адчыніў мне дзверы. Ён быў у фартушку і выглядаў як кухарка. Я рассмяяўся.

— Ну! — адказаў смехам жывапісец. — Заходзь, калі ласка.

У майстэрні-пакоі сядзелі мае сябры: Аня, Томак, Ярак, Марта, Мілаш, Міхась і Максім. Яны елі торт, які падрыхтаваў сам Нор Узі.

— Ёсць праблема, — пачала Аня.

— Што сталася?

— Нам пагражае небяспека!

— Гавары канкрэтна.

— У „Горкаўскіх навінах” пішуць, што сёння прыязджае пан Любаноўскі.

— Гэта жах! — я ўсхваляваўся і перастаў есці торт.

Вы можа не памятаеце, што Любаноўскі гэта той тып, які маніякальна хоча ўзарваць нашу камяніцу?

Супакоіў нас Нор Узі.

— Ёсць спосаб, — мастак уручыў мне пляшачку з жоўтым парашком. — А цяпер ідзіце на панадворак і сустракайце таго Любаноўскага. Ён неўзабаве сустрэнецца з паняй Клемянцінай.

Мы ўсе паперлі на панадворак. Патрапілі ў момант. Любаноўскі ўручыў спадарыні Клемянціне аўтаручку, каб распісалася. Я падбег да яго і сыпнуў на яго жоўтым парашком.

— Вой! — усклікнулі мае сябры ды пачалі мне апладзіраваць. У паветры раздалося гучнае „БРАВА”!

Той дзядзька бясследна счэз, а спадарыня Клемянціна пабегла ў другі бок.

Мае сябры і я цешыліся, як малыя дзеці.

З акна нам памахаў Нор Узі.

* * *

Зараз я і большасць маіх сяброў — вучні гімназіі. Я ў адным класе з Аняй, Томкам, Мартай, Яркам і Мілашам. Нашай выхавацелькай настаўніца біялогіі, Раманоўская. Яна любіць называць нас імёнамі жывёл і раслін.

Спадарыня Раманоўская любіць, калі гаворым пра магію. Яна верыць у мудрасць звяроў і дрэў. Яна, чамусьці, раз нагадвае нам Нор Узі, а іншы раз — яго сястру Алісу Чараўніцу.

У кожным выпадку мы робім усё, каб па біялогіі мець адны шасцёркі.

(нак-с)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Выступае „Галілея"

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У Новым Корніне дэкламуюць вершы пра вясну

З падзякай за вершы

— У маіх вершах сэрца наўсцяж, — кажа ў адным са сваіх вершаў Віктар Швед. Трэба дадаць: у іх шчырая любоў да роднай зямлі, прыроды, людзей. Ну, і асноўнае — любоў да дзяцей. Віктар Швед умее жартаваць, рассмяшыць дзіцячую грамаду да слёз. І на дадатак, з гэтага смеху, звычайна ў канцы твора ёсць навука. Мараль.

23 сакавіка, дакладна ў 78-годдзе з дня нараджэння, Віктару Шведу наладзілі бенефіс. Ініцыятарам і арганізатарам свята быў мецэнас Пятро Юшчук. Урачыстасць праходзіла ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку.

Сцэнарый святкавання прыдумалі дзве незвычайныя дзяўчынкі — Наталька Швед і Элька Юшчук. Іх думка была простай і займальнай. Для кожнага выступлення прыдумалі каментар — інтэлігентны, жартаўлівы, сугучны вершам паэта. Дзяўчаты, вядома, выступілі на беларускай мове.

Яшчэ мы не сказалі галоўнага — мерапрыемства было падарункам ад дзіцячага калектыву „Галілея". Хор дзейнічае пры парафіі Прамудрасці Божай у Беластоку. Іх кіраўніком — Раман Зубрыцкі. І вось „Галілея" праспявала некалькі рэлігійных песень, а паміж спевамі многія харысты дэкламавалі вершы паэта. На польскай і беларускай мовах. Выступіў таксама Генадзь Шэмет са сваімі сынамі — Янкам і Франкам. Разам з хлопцамі спявала Наталля Швед. Спявалі, вядома, песні на словы Віктара Шведа („Белы караблік" і „Канікулы").

Цікава пра творчасць і асобу Юбіляра расказала магістр Ірэна Максімюк. Спадарыня Ірэна напісала магістэрскую дысертацыю пра дыдактычныя каштоўнасці паэзіі Віктара Шведа.

Былі віншаванні, кветкі і шыкоўны торт са свечкай-фантанам. І салодкі пачастунак для ўсіх.

Віктар Швед усхваляваўся да слёз.

(гак)

Віктар Швед

Праўду гавары, сыночак

Пажадаць сыночку хоча
Бацька шчыра ў Новы год.
— Праўду гавары, сыночак,
Будзе меней перашкод.

Шанаваць больш будуць людзі,
Стане жыць табе лягчэй,
Задумоўвацца не будзеш,
Што сказаў аб тым раней.

Наша настаўніца

Хваліць настаўніцу Ваня,
— Разумная нашая пані.
Яна ўсё ведае, умее,
Навучыць нас шмат, ёсць надзея.

— Хваліш яе ты замнога,
Яе здабытак убогі,
Яна ж сядзіць, — кажа Бася, —
Дзесяць гадоў у адным класе.

У чаканні буслоў

У гэтым годзе ўся вёска доўга чакала буслоў. А яны не ляцелі. Старыя гнёзды, якія высушыў вецер, абагрэла сонейка, чакалі таксама, каб перавіць-паправіць іх галінкамі ды травой, знесці ў іх яйкі, выседзець маладых клекатуноў, якія спачатку будуць здзіўлена шыпець, пазіраючы на новы свет... І паспець трэба, каб буслікі выраслі, падужэлі, каб змаглі разам з дарослымі бусламі вярнуцца на зімоўку. А, можа, лепш сказаць — яны вяртаюцца сюды. Буслы, якія жывуць у нас, прылятаюць аж з Паўднёвай Афрыкі — колькі ж гэта тысяч кіламетраў у паветры намахаешся крыламі, колькі натугі ў галаве і вачах, каб не сысці са шляху... Што вядзе бусла на радзіму? Што загадвае яму збірацца ў такую небяспечную дарогу — і яму, і ўсёй сям'і, і ўсёй буслінай грамадзе, якая мусіць арганізавана, паслушна ды згодна махаць крыламі насустрач сонцу? А, вось, і не прыляцелі...

На дарозе буслам на радзіму ўзняліся клубы дыму, на вышыні буслінага палёту загудзелі самалёты-бамбавозы ды іншыя, такія падобныя на драпежных птушак. Уздрыгнула зямля. Цёмна, страшна, небяспечна. І хоць кліча радзіма — як прабіцца праз цемру і гул?

— Трэба маліцца і за буслоў, — сказала баба Верка праўнуку Паўліку. Бабуля ведае шмат малітваў і замоў. Не раз і звяры прыходзілі да яе прасіць дапамогу. І коцікі, і сабакі, і птушкі розныя, нават вожык прытупаў з лесу. Баба Верка, якой ужо амаль дзевяноста гадоў, ужо зусім згорбленая, дык усё бачыць добра, што нізенька на зямлі ці паўзе, ці бегае. Нават на мурашку баіцца наступіць, шкадуе. Праўда, акуляры трэба ўжо насіць, „падвойныя вочы", як тлумачыць жартам старажылка. Адагнецца бабуля, гляне на пустыя гнёзды, і перахрысціцца.

— Бусел — сімвал міру, — кажа Паўліку бабка. — Не так нават галубок, як бусел. Сімвал міру, сям'і, вернасці.

І Паўлік задзёр галаву, гледзячы на стадолу, на даху якой калісьці падрыхтавалі былі месца на буслінае гняздо. Год чакалі на тое, каб якая бусліная сям'я аблюбавала месца. Буслы калісь сяліліся на саламяных стрэхах. Цяпер можна ўбачыць іхныя гнёзды нават на электрычных слупах, на адмысловых вышках, каб буслінай сям'і не шкодзіў электраток.

— Пытаешся, Павел, якая малітва можа памагчы буслам? Імі Гасподзь апякуецца, так як і людзьмі.

— А вайну ж людзі выдумалі.

— Дык супраць вайны малітву складзем, супраць злосці і смерці. Такія малітвы кожны дзень кажуць мамы, бабулі. І моўчкі, і ўголас.

Селі Паўлік з бабай Веркай на лаве пад плотам, склалі рукі. І моўчкі сталі малітву складваць, жадаць і людзям, і буслам чыстага неба.

Міра Лукша

Беларуская мова ў маім класе

Мы заўсёды ахвотна ходзім на ўрокі беларускай мовы. Вывучаем літаратуру і граматыку. У кожную суботу чытаем „Зорку" — старонку для дзяцей. Рашаем крыжаванкі, чытаем розныя артыкулы, вывучаем на памяць вершы Віктара Шведа. „Зорка" гэта наш дапаможнік. Па ёй мы вывучаем беларускую мову. Мы любім урокі роднай мовы. Яны вельмі цікавыя. Беларускай мове вучыць нас настаўніца Міраслава Маркевіч.

Юліта Гладыш,
V „а" кл. бельскай „тройкі"

Уладзімір Арлоў, Адкуль наш род

Францішак Багушэвіч

Маладыя гады

Францішак нарадзіўся ў 1840 годзе ў шляхецкай сям'і ў фальварку Свіраны паблізу Вільні. Неўзабаве бацькі пераехалі ў свой маёнтак Кушляны непадалёку ад Ашмянаў. Там прайшло Францішкава дзяцінства. Там у ягоным сэрцы назаўсёды пасялілася любоў да роднай беларускай зямлі і роднай мовы.

Бацькі выправілі сына вучыцца ў Віленскую гімназію. Гімназічнымі сябрамі будучага паэта сталі разумныя і смелыя хлопцы Ціт і Кастусь Далеўскія, Жыгімонт (Зыгмунт) Мінейка, Юльян Чарноўскі. Яны ненавідзелі расійскія парадкі і марылі пра час, калі Бацькаўшчына здабудзе сабе незалежнасць. Надзейным Францішкавым сябрам быў ягоны малодшы брат Валяр'ян, які таксама вучыўся ў Вільні.

Гімназію Францішак скончыў у ліку чатырох найлепшых вучняў. Добрыя веды дазволілі яму паступіць у Пецярбургскі універсітэт. Але вучыцца там Багушэвічу не давялося.

Якраз тады царскія ўлады ўвялі новыя універсітэцкія правілы. Студэнтаў пазбавілі шмат якіх правоў. Францішак з таварышамі пастанавілі змагацца і адмовіліся атрымаць свае заліковыя кніжкі, куды выкладчыкі ставяць адзнакі. За гэта змагароў за справядлівасць выключылі з універсітэта.

Тым часам адзін з першых беларускіх паэтаў XIX стагоддзя Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч заклікаў адукаваных суайчыннікаў несці свайму народу веды. Вярнуўшыся з Пецярбурга ў Беларусь, Багушэвіч таксама пайшоў працаваць настаўнікам у вясковую школку.

(працяг будзе)

25 Сакавіка ў Гданьску

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Сям'я Лукаша Дзекуць-Малея і беларускія дзеячы з „Хаткі". Біблію чытае Лена Глагоўская

Гданьск. Гарнізонны могільнік. Ужо чацвёрты год запар святкаванне 25 Сакавіка пачынаюць тут ад ускладання кветак на магіле Лукаша Дзекуць-Малея і яго жонкі Серафімы. Прыйшла сям'я, мясцовыя беларусы, прэсвітэр касцёла хрысціян-баптыстаў. Ёсць генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Гданьску Міхал Аляксейчык. Прыбылі ўлады горада: віцэ-прэзідэнты Гданьска — Шчэпан Леўна і Вальдэмар Ноцны, намеснік старшыні Рады горада Яўгеніюш Вэнгжын, радны Мацей Лісіцкі.

Над магілай прыздобленай бел-чырвона-белым сцягам прэсвітэр Міраслаў Паталён чытае фрагмент Бібліі ад свята Лукаша.

— Вера ў адраджэнне дарыць надзею, — каменціруе прачытаны фрагмент.

Той жа самы ўрывак чытае старшыня Таварыства „Хатка" д-р Лена Глагоўская. У руках беларускі пераклад, які ў 20-я гады зрабілі сужонства Лукаш і Серафіна Дзекуць-Малеі.

Касцёл хрысціян-баптыстаў і „Хатка" выступілі да ўлад горада, каб імем Дзекуць-Малея назваць адну з вуліц горада.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ля магілы Дзекуць-Малеяў. Злева: Міраслаў Паталён, Яўгеніюш Вэнгжын (памёр 7 красавіка 2003 г.), Шчэпан Леўна, Вальдэмар Ноцны, Мацей Лісіцкі і Міхал Аляксейчык

Лукаш Дзекуць-Малей вядомы не толькі як беларускі дзеяч, які браў удзел у стварэнні БНР у 1918 годзе. У пасляваенныя гады арганізаваў касцёл баптыстаў і служыў прэсвітэрам у Гданьску.

— To jaka u Białorusinów jest religia, — пытае адзін з прэзідэнтаў.

Беларуская меншасць у Гданьску розных канфесій. Побач праваслаўных шмат каталікоў, ёсць пратэстанты, мусульмане:

— No, mamy chyba wszystkie, — кажуць у адказ.

Мы выйдзем шчыльнымі радамі

Так як адсвяткавалі 25-га Сакавіка ў Гданьску — у Беластоку нельга нават уявіць. Патранат над 85-й гадавінай абвяшчэння БНР узяў прэзідэнт горада Павел Адамовіч.

Далейшае святкаванне праходзіла ў самым прэстыжным месцы горада — у Двары Артуса. У актавай зале прыздобленай бел-чырвона-белым і бел-чырвоным сцягамі прагучэлі незалежніцкія гімны „Мы выйдзем шчыльнымі радамі" і „Магутны Божа". Выканала іх гарадская Cappella Gedanensis. Затым голас узяў Павел Адамовіч:

— Czuję się tu jak między swoimi, — сказаў, раней прывітаўшыся з сабранымі словамі: „Добры дзень!" Згадаў пра сваіх продкаў, якія прыбылі ў пасляваенны Гданьск з тэрыторыі сённяшняй Беларусі і Літвы.

Прэзідэнт адзначыў ранг свята і тое, што ў 1921-1924 гадах у вольным горадзе Гданьску знаходзілася прадстаўніцтва БНР. — Dziś cieszy mnie tak duża frekwencja, — дадаў, — życzę aby wszystkie problemy niezależnej Białorusi zostały przekroczone.

У час размовы для „Нівы" Павел Адамовіч пахваліў беларускую меншасць.

— To najbardziej aktywna i liczna grupa zaraz po Niemcach.

У бюджэце горада няма спецыяльнага фонду на дзейнасць меншасці, грошы можна атрымаць на канкрэтныя праекты. Іх сума не можа перасягнуць 50 тысяч злотых.

У атмасферы скандалу

Над мастацкай выстаўкай Пётры Сергіевіча, якая папоўніла праграму святкавання, вісеў скандал. Адна з уласніц карцін пакрыўдзілася на арганізатараў і не дала сваіх карцін. Пайшло пра літарку „г" у прозвішчы мастака.

— Wujek nazywał się Siergijewicz i był prawdziwym Polakiem i nie widzę sensu, aby robić z niego Białorusina.

У буклеце, які выйшаў з нагоды выстаўкі, мастак выступіў як „Sierhijewicz".

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Прамаўляе прэзідэнт Гданьска Павел Адамовіч

Праблемай літаркі „g" і „г" занялася мясцовая прэса. У час вернісажу не дайшло да скандалу.

— Пётр быў вялікім мастаком і беларусам, — успамінаў у час вернісажу Станіслаў Паплаўскі, які ведаў віленскага мастака з 1919 года.

— Не хацеў выехаць у Польшчу, бо лічыў, што тут памрэ ад настальгіі па родным кутку, людзях.

Пра жывапісца расказвалі д-р Лена Глагоўская, пасол Міхал Аляксейчык, сваячка мастака Віялета Доўгір-Казьмінская.

Публіка адкрыта выяўляла сваё захапленне і паклон у гонар галоўнай арганізатаркі — д-р Лены Глагоўскай.

— Нашая Лена — шалёная, — сказаў Мацей Канапацкі, — шалёная ў самым пазітыўным сэнсе!

На святкаванне прыйшло як ніколі шмат народу, больш за сто асоб. Пад бел-чырвона-белым сцягам моладзь рабіла памятныя здымкі.

— Bo to jest nasza prawdziwa flaga, — патлумачыў сяброўцы адзін маладзён.

Сярод нашай меншасці адчуваўся гонар за прыналежнасць да беларускай нацыі.

— Над вашым святкаваннем працуюць нейкія добрыя зоркі, — адзначыў гданьскі фатограф Януш Баланда-Рыдзеўскі.

Мерапрыемства завяршылася традыцыйнай вячэрай, якую гэтым разам Таварыства „Хатка" наладзіла ў гасцінным Доме паяднання і сустрэч айцоў францысканцаў.

Ганна Кандрацюк

Шкодная канкурэнцыя

Годна і прыстойна адзначаюць галоўнае свята беларускай дзяржаўнасці беларусы ў розных краінах свету. І няма ніякай залежнасці ці з'яўляюцца яны карэннай нацыянальнай меншасцю як у Польшчы і Прыбалтыцы, ці цягам мінулага стагоддзя апынуліся на далёкай чужыне як палітычныя альбо эканамічныя эмігранты. У той жа час у самой Беларусі святкаванне першага абвяшчэння незалежнасці можа прывесці на лаўку падсудных.

Масава святкаваць 85-я ўгодкі незалежнасці БНР у Мінску намерваліся дзве грамадскія структуры. Першая — адмыслова створаны Нацыянальны камітэт па святкаванні, куды ўвайшлі, між іншымі, Кансерватыўна-хрысціянская партыя БНФ, Малады Фронт, асобныя відныя дзеячы культуры. Другая — Партыя БНФ, аб'яднаныя сацыял-дэмакраты, некаторыя няўрадавыя арганізацыі. Здаецца, чаго дзяліць — свята адно для ўсіх, тым больш амаль забароненае. Не, кожнаму трэба паказаць, што ён лепшы за іншых і на яго акцыю прыйдзе больш людзей чым на акцыю „канкурэнта". І таму калі першыя запланавалі святкаванне на нядзелю 23 сакавіка, то другія ніякім чынам не маглі да іх далучыцца і абвесцілі аб „сваім" святкаванні 25-м чыслом. На кожнае мерапрыемства арганізатары мусілі прасіць дазволу ў гарадскіх улад. І дазволы былі дадзены. Але такія, якія больш задавальняюць палітычных праціўнікаў арганізатараў-дэмакратаў — далей ад цэнтра горада і ў меншай магчымасці паказаць сябе, а дакладней прайсціся па цэнтральных вуліцах беларускай сталіцы. Арганізатары нядзельнага святкавання падалі скаргу ў суд, але сабраліся там дзе планавалі спачатку. Вынік — фактычны разгон маніфестантаў, затрыманні, судовыя пакаранні ад папярэджання да 15 сутак арышту. У акцыі ўзялі ўдзел каля 200 чалавек.

У другім выпадку мінскія ўлады не дазволілі прайсці па праспекце Скарыны, накіраваўшы святкуючых у парк Дружбы Народаў, каб тыя пахадзілі вакол яго ў колькасці не большай за 900 чалавек. На гэтае мерапрыемства прыйшло зноў жа 200-250 чалавек.

Зразумела, можна і трэба казаць пра непрыхільнае стаўленне сённяшняй беларускай улады да самой ідэі БНР і ў адказах на просьбы аб дазволе не цяжка знайсці парушэнні дзеючага заканадаўства, але ці могуць супрацьпаставіць хоць нешта дзейснае арганізатары сёлетніх „здвоеных" святкаванняў? Здаецца, не. Ва ўсялякім разе пакуль. Таму варта не далучыцца да слоў старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонкі Сурвілы выказаных з нагоды юбілейнай даты: „Сёння заклікаю кожнага палітычнага і арганізацыйнага лідэра: яднайце людзей вакол ідэалаў 25-га Сакавіка і яднайцеся паміж сабою. Незалежнасці мы паасобку не абаронім. Рэжыму паасобку не зменім. Дабрабыту нашага народу паасобку не дасягнем".

А пакуль святкаваць Дзень Волі на вуліцы беларускіх гарадоў выходзіць з кожным годам усё менш і менш людзей.

Уладзімір Лапцэвіч

Святкаванне ў Познані

Маючы запрашэнне на святкаванне 85 угодкаў абвяшчэння БНР ва універсітэце ў Познані з цікавасцю назіраю за маладымі людзьмі, якія рыхтуюць гэтую ўрачыстасць. Арганізатары свята — студэнты з Беларусі і Польшчы. Як мне вядома, частка польскіх студэнтаў вывучае беларускую мову. Універсітэцкая зала: на сцяне бел-чырвона-белае палотнішча, герб Пагоня і сцяг БНР. Удзельнікаў больш за 20 асоб. Студэнткі (іх большасць), студэнты — сярод іх бачу семінарыста, ёсць некалькі чалавек і сталага ўзросту. Урачыстасць пачынаецца гімнам „Мы выйдзем шчыльнымі радамі". Чытанне ліста-віншавання ад спадарыні Івонкі Сурвілы. Выступленні дакладчыкаў. Малы пачастунак, азнаямленне з праграмай дзейнасці Беларускага цэнтра ў Познані. Фільм пра гісторыю перамен беларускай дзяржаўнасці...

Калі мы па заканчэнні вярталіся з сябрам Вітаўтам Адамовічам, а ён сустрэчай быў вельмі задаволены, мы дайшлі да вываду, што калі ў асяроддзі не завядзецца (або хто іх не нашле) „бунтароў", то людзі могуць цалкам згодна і плённа працаваць.

Анатоль Маўчун

Васіль Белаказовіч — чалавек навукі

У рамках сёмага выпуску прэзентацыі „Твары вядомыя і невядомыя" ў Бельскім доме культуры 27 сакавіка адбылося спатканне з прафесарам Васілём Белаказовічам — кіраўніком Кафедры ўсходнеславянскай гісторыі і культуры Вармінска-Мазурскага універсітэта. Прафесар з'яўляецца аўтарам больш дзесяці кніжак, рэдактарам і заснавальнікам навуковых часопісаў, грамадскім дзеячам, педагогам, пад вокам якога паўстала каля сотні магістэрскіх, доктарскіх і габілітацыйных дысертацый.

Васіль Белаказовіч нарадзіўся 2 студзеня 1932 года ў вёсцы Відава каля Бельска-Падляшскага. Дзяцінства яго выпала на гады ваеннага ліхалецця. На самым пачатку верасня 1939 года ў Відаве з'явіліся немцы, якія не праяўлялі злых намераў. Двух нават пражывала ў хаце Белаказовічаў. Потым было радаснае прывітанне жыхарамі вёскі савецкай арміі, якое хутка замянілася ў страх перад вывазам на „белыя мядзведзі". Аднак да чэрвеня 1941 года нічога дрэннага не здарылася, калі ў Відаве зноў паявіліся нямецкія войскі і пачалася акупацыя. Тады загінуў брат маці прафесара Цімафей Асеннік, і родныя з боку бацькі, якія жылі ў Райску.

Вучобу Васіль Белаказовіч пачаў у польскай школе ў Відаве, а пасля прыходу савецкай улады трапіў у беларускую школу, у якой вучыла сям'я Канрадаў з Пецярбурга. Нямецкія акупанты сарганізавалі школу ў сінагозе па вуліцы Ягелонскай у Бельску, дзе вучылі беларускай і нямецкай моў. Пасля вызвалення, да 1947 года вучыўся ў беларускай школе, кіраўніком якой быў Яраслаў Кастыцэвіч, а пасля яе ліквідацыі трапіў у польскі ліцэй імя Тадэвуша Касцюшкі, які закончыў са званнем „перадавіка грамадзянскай працы і навукі". Узнагародай была паездка ў 1951 годзе ў Берлін на Сусветны з'езд моладзі.

Прафесар успамінае з усмешкай, як хацеў вывучаць гісторыю ў Савецкім

Саюзе, але запрапанавалі яму рускую філалогію.

— У гэтай справе звярнуўся я нават да міністра асветы Гадомскага, і хаця гаварыў я яму, што хачу пазнаваць сапраўдную гісторыю айчыны Леніна і Сталіна — не памагло. Міністр адказаў, што вывучаючы рускую філалогію „з шырока адкрытымі вачыма" таксама можна пазнаць сапраўдную гісторыю. Так і сталася.

У 1951 годзе Васіль Белаказовіч выехаў у Савецкі Саюз. У Маскве атрымаў накіраванне ва універсітэт у Ніжнім Ноўгарадзе (тады Горкі), дзе пасля года ўдалося яму атрымаць дазвол на экстэрністычнае штудзіраванне гісторыі. Высокія ацэнкі на экзаменах, узнагароды за працы — гэта пачатак навуковай дзейнасці прафесара. То там, на універсітэце ў Горкім пачалося падарожжа слядамі Льва Талстога, якое трывае і да сённяшняга дня. Пасля накіравання ў Ленінград, бо Горкі стаў горадам закрытым, дзякуючы рэкамендацыям гісторыка рускай літаратуры прафесара Краснова малады вучоны трапіў у Музей Талстога ў Маскве.

— Гэта былі гады! — успамінае прафесар. — Талстой атрымаў каля 60 тысяч пісьмаў, сам адказаў на 12 тысяч з іх. Там паказалася мая гістарычная натура!

Прафесар прысвяціў Льву Талстому магістэрскую і доктарскую дысертацыі, але на гэтым не закончыў. Да сённяшняга дня паяўляюцца артыкулы на гэту тэму (а ўсіх, толькі апублікаваных мае прафесар на сваім рахунку больш за паўтысячы).

Шасцідзесятыя гады гэта вяртанне ў Польшчу, пачатак працы на Варшаўскім універсітэце, сутыкненне з Ежы Енджэевічам (аўтарам культавай для ўкраінцаў кніжкі пра Тараса Шаўчэнку („Noce ukraińskie albo rodowód Geniusza. Rzecz o Tarasie Szewczence"), а ў выніку і са справамі ўкраінцаў. Доказам гэтаму з'яўляюцца работы прафесара на ўкраінскай мове, напрыклад, пра карэспандэнцыю ўкраінцаў Падляшша, Холмшчыны і Лэмкаўшчыны з Львом Талстым, біяграфічныя ноты пра ўкраінскіх вучоных, паэтаў. Будучы членам Таварыства Варшава—Кіеў прафесар да сёння прымае ўдзел у мерапрыемствах прысвечаных польска-ўкраінскім узаемаадносінам, а на універсітэце ў Ольштыне выкладае гісторыю Украіны.

Навуковая дзейнасць Васіля Белаказовіча звязана не толькі з рускай ці ўкраінскай культурай, але і з беларускай. Ад 1957 года, калі ў часе работы на універсітэце „папала ў рукі цікавая газета, якую выдавалі ў Беластоку, — успамінае прафесар, — пастанавіў я наведаць рэдакцыю, дзе пазнаёміўся з Георгіем Валкавыцкім, тагачасным рэдактарам „Нівы", які запрапанаваў мне супрацоўніцтва".

З таго часу ў нашым тыднёвіку пачалі друкавацца артыкулы прафесара Белаказовіча: „Шляхамі гісторыі", „Заснаванне Віцебска", „Бельск — сталіца паўночнага Падляшша", „Беларуская мова і польская культура" — гэта толькі некаторыя з іх.

Польская акадэмія навук стала месцам працы прафесара Белаказовіча ў сямідзесятыя і васьмідзесятыя гады. Тады заснаваў ён часопіс „Studia Polono-Slavica Orientalia. Acta Litteraria", пачалася работа над выданнем штоквартальніка „Slavia Orientalis".

Палітычныя перамены дзевяностых годоў давялі да таго, што прафесар пераехаў у Ольштын, дзе працуе да сённяшняга дня.

Шырокія зацікаўленні Васіля Белаказовіча ў галінах гісторыі літаратуры, культуры ўсходніх славян адлюстраваліся ў яго навуковай дзейнасці, якая ўзнагароджана была прысваеннем звання доктара honoris causa універсітэтаў у Ленінградзе і Ніжнім Ноўгарадзе. Прозвішча Васіля Белаказовіча паявілася і ў „Залатой кнізе польскай навукі 2000. Навукоўцы пералому вякоў", увайшло яно і ў энцыклапедычных даведнікі, біяграфічныя слоўнікі.

На спатканні ў Бельскім доме культуры, на якое прыбылі і старэйшыя, і малодшыя жыхары горада, прафесар Белаказовіч гаварыў не толькі аб сваім жыцці. Гістарычныя весткі пра выдатных бяльшчан з мінулых стагоддзяў перапляталіся з сучаснай сітуацыяй краіны, весткамі пра Еўрасаюз, значэннем традыцыі ў жыцці народа — а гэта ўсё пераказана было з такой жыццярадаснасцю, што ў публікі складалася ўражанне ў магічным значэнні кожнага слова.

Прафесар Васіль Белаказовіч, уроджанец Падляшскай зямлі, з уласнага вопыту дасканала ведае складаныя, і часта неадназначныя нацыянальныя, рэлігійныя і этнічныя праблемы Малой Айчыны — як часта называе Падляшша. Дасканала сарыентаваны ва ўзаемаадносінах паміж Польшчай і другімі ўсходнеславянскімі краінамі з'яўляецца праціўнікам канфліктаў і прыхільнікам супрацоўніцтва паміж меншасцямі.

Паўліна Шафран

Чаму ў белгімназію?

З 31 сакавіка выпускнікі падставовых школ могуць падаваць заявы з дакументамі ў выбраныя гімназіі. У Гайнаўцы і Бельску-Падляшскім ёсць магчымасць вучыцца ў гімназіях з дадатковым навучаннем беларускай мовы.

Гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы прапануе добрыя ўмовы для вучобы і высокі ўзровень навучання і таму ў мінулых гадах было многа ахвотных вучыцца ў гэтай школе. Вучоба адбываецца ў новым дыдактычным будынку, узведзеным у 1993 годзе. Некалькі гадоў пазней пабудавана была пры ім гімнастычная зала, у якой адбываюцца гарадскія і павятовыя спаборніцтвы. Гімназісты могуць карыстацца двума камп'ютэрнымі, нядаўна абсталяванымі заламі і вялікай сталовай. З дапамогай настаўнікаў вучні дабіваліся поспехаў у прадметных конкурсах. Паводле рэйтынгу арганізаванага „Выбарчай газетай" і Кураторыяй у Беластоку Гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы станоўча вылучаецца з ліку 55 гімназій Падляшскага ваяводства, якія прынялі ўдзел у спаборніцтве. Займае яна 22 месца ў маштабе ваяводства і першае ў самой Гайнаўцы. Арганізатары рэйтынгу звярталі ўвагу на поспехі вучняў у вучобе, прадметных конкурсах, умовы навучання, узровень падрыхтоўкі настаўнікаў, пазашкольную дзейнасць і высока ацэньвалі гімназістаў, якія пасля паступалі ў ліцэі.

У гайнаўскай белгімназіі козырам з'яўляецца вучоба пад наглядам настаўнікаў, якія вядуць таксама заняткі ў Агульнаадукацыйным ліцэі з дадатковым навучаннем беларускай мовы. У мінулым годзе каля 75% вучняў белгімназіі паступілі вучыцца ў беларускі ліцэй. Некаторыя бацькі пасылаюць дзяцей вучыцца ў невялікую белгімназію (178 асоб), бо там добрая атмасфера сярод вучняў і лягчэй, чым у вялікіх гімназіях, захаваць дысцыпліну.

Нядаўна дырэкцыя Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы выслала ў падставовыя школы інфармацыю аб умовах набору вучняў у іх школу. Прадбачваецца прыняць 60 вучняў у два першыя класы. Калі колькасць кандыдатаў перавысіць лік вольных месцаў, будзе праводзіцца набор паводле зацверджаных белгімназіяй крытэрыяў. Ацэньвацца будуць рэзультаты вучобы па польскай, беларускай, замежных мовах, гісторыі, матэматыцы і прыродзе. За шасцёркі па гэтых прадметах на пасведчанні з падставовай школы вучні атрымаюць па чатыры балы, за пяцёркі — па тры, за чацвёркі — па два і за тройкі — па адным. Аднак у першую чаргу прымацца будуць лаўрэаты ваяводскіх элімінацый прадметных конкурсаў. Калі вучні набяруць аднолькавую колькасць балаў, у першую чаргу будуць прымацца дзеці настаўнікаў, сіроты, выхаванцы дзіцячых дамоў і кандыдаты з выключнымі здольнасцямі, якія вучыліся паводле індывідуальнай праграмы вучобы. Дакументы можна падаваць да 16 мая, пасведчанні аб заканчэнні вучобы ў падставовай школе — да 24 чэрвеня, а спіскі прынятых вучняў абвешчаны будуць 27 чэрвеня. Больш дэталёвыя інфармацыі можна знайсці на інтэрнэт-старонцы: http://klub.chip.pl/lo2hajn

Аляксей Мароз

Таленты з Мінска

29 сакавіка г.г. у сярэдняй музычнай школе ў Беластоку праходзіў канцэрт маладых талентаў з Мінска. З Беларусі, разам з прафесар Яўгеніяй Гарбуновай прыехала чатырох піяністаў: Аляксандра Белянковіч, Кацярына Марэцкая, Таццяна Панасюк і Андрэй Калаткоў.

— Хто такія мае вучні? — прафесар Гарбунова расказвае пра сваіх выхаванкаў:

Андрэй, наймалодшы ў групе, ад года ён вучань Рэспубліканскай музычнай школы. У Мінск хлопчык прыехаў з глыбінкі. Адкрыла яго мая вучаніца, якая там навучае музыкі. Дзяўчаты маюць ужо значныя поспехі. Васемнаццацігадовая Аляксандра Белянковіч — лаўрэатка двух міжнародных конкурсаў — у Літве (конкурс Дварыёнаса) і ў Польшчы (Шапэнаўскі конкурс для моладзі ў Антаніне). Таксама Каця Марэцкая — дыпламантка міжнароднага конкурсу.

Сустрэчы мінскіх і беластоцкіх музыкантаў маюць ужо дзесяцігадовую традыцыю. Іх мэта — абмен музычным досведам.

— Мы вучымся ад моладзі з Беларусі, а яны ад нас, — кажа Галіна Маркова, ініцыятарка і арганізатарка сустрэч. Як настаўніца музычнай школы ў Беластоку, адзначае:

— Таленты заражаюць амбіцыяй, даюць інспірацыю.

Мінскія піяністы знаёміліся таксама з Польшчай і яе культурай. Яны наведалі Кракаў, Супрасль, Бельск-Падляшскі. Выступілі з канцэртамі. У іх выкананні можна было пачуць творы Шапэна, Рахманінава, Дэбюсі, Мендэльсона.

Галоўны спонсар візіту — Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь.

(гак)

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Крыж пад Копнай Гарою

Адна сям'я са спіска была на хрысцінах у Вярхлесе. Жонка з дзецьмі вярнулася вечарам у Сакалду, каб вокны пазакрываць, а муж астаўся начаваць на хрысцінах. І яе з дочкамі забралі...

У іншай сям'і гаспадыня падаіла кароў і ўжо сыноў адпраўляла гнаць іх на пашу. Але немцы іх завярнулі. Каб чуць-чуць, то тыя хлопцы кароў пагналі б...

* * *

Спыталі солтыса, што з гэтымі людзьмі рабіць, а ён хіба адказаў:

— Што хочаце, тое і рабіце.

І сам солтыс баяўся.

* * *

Пагналі ўсіх у Лазні,

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Крыж на месцы злачынства

Пазнавалі па вопратках

Быў тут ляснічы Дзікоўскі, ён даглядаў, як рабілі грэблю. Яго цесці паехалі ў касцёл, а жонка з дачкой у хаце асталася. Пабачыла, што ў іх стадоле поўна людзей, пералякалася. Як ляснічы вярнуўся, яна яму расказала і ён на Копную Гару пабег, немцам далажыў. Ён вярнуўся дахаты, а немцы зрабілі засаду. Ляснічы пачуў, што хтось ходзіць і выбег з хаты за стадолу да немцаў. А яны думалі, што гэта партызан бяжыць і застрэлілі яго. А тых партызанаў ужо ў стадоле не было.

Было гэта вясною, калі сена касілі. Таго ляснічага забілі ўвечары, а ўжо на другі дзень немцы аблаву ў вёсцы зрабілі. Мой брат рана ў Крамяным лонку скасіў, прыйшоў дахаты і кажа:

— Ну, канец! Скасіў і можна адпачываць.

І сеў махорку кроіць. І яго так, у кашулі, забралі. Пазганялі людзей на Копную Гару, загналі ў хлеў і пабіць хацелі. То тыя, што тут асталіся, назбіралі чаго і ў Супрасль да начальства паехалі. І ён загадаў выпусціць. А дзеці чакалі бацькоў у канцы вёскі і як бацькі вярнуліся, дык яны ім на шыі кідаліся.

Адзін немец ці хто, што немцам дровы загатаўляў, хацеў пераначаваць у аднаго гаспадара. Той гаспадар пайшоў на панадворак і нёс куль саломы падаслаць яму. У гаспадара было дзве дачкі і яны сталі бацьку прасіць, каб таму пану паслаць на ложку, а яны будуць спаць на той саломе, на падлозе. А бацька адказаў ім:

— Таму сабацы і так добра!

Той госць даклаў пра здарэнне немцам у Копную Гару. З Беластока прыехала гестапа і забіралі цэлыя сем'і паводле спіска. Мой брат быў калісь на сходзе на Копнай Гары, там выступіў і гаварыў, што пры Польшчы солі белай нельга было купіць, толькі чорную ў шматках. А быў такі гаёвы, што ўсё ўдаваў, хто з кім і што рабіў. І майго брата, браціху і абоіх іх сыноў забралі. А за што забіралі, таго ніхто і не даведаўся.

загналі ў адну хату. Там на панадворку яма для бульбы была, загадалі тую яму раскапаць. А пасля выводзілі з хаты, кідалі ў тую яму і стралялі.

Мы думалі, што іх куды вывезуць. Але сядзімо за стадолай і чуем: Бах! Бах! Б'юць!

Тую яму завалілі, але зямля варушылася, дык яшчэ дзевятнаццаць фур пяску навазілі.

Таму, што ў Вярхлесе на хрысцінах быў астаўся, неяк нядобра было зрабілася і ён пайшоў дахаты. Затрымалі яго каля Сакалды і пытаюць:

— Што з табою зрабіць?

— Тое, што і з маімі дзецьмі, — адказаў ён.

І яго адвялі пад Копную Гару і там забілі; сёння там крыж стаіць.

Назбіралі людзі хабару — палатна на касцюмы, і падаліся ў Супрасль да нямецкага начальніка, каб дазволіў пахаваць нябожчыкаў. 19 кастрычніка дазволілі іх забраць. Ноччу, хто якую труну збіў з дошак, забіралі пабітых у стадолу і ў такую труну клалі. Нябожчыкаў пазнавалі па вопратках. Мой брат быў у зялёным, ён аб сценку ямы абаперты быў, быццам стаяў. Побач яго, таксама стаялі, яго сыны, а за імі жонка. Да досвітку патаемна на могілкі ў Супрасль павазілі і там пахавалі кожную сям'ю на сваім месцы. Толькі пахавалі і адразу вярнуліся дадому, не было ніякай малітвы.

Той, што меў на саломе начаваць, гаварыў пасля:

— Jak dochodzę do tego domu i spojrzę, i wspomnę te dziewczynki, to płaczę...

* * *

У Лазнях, на сённяшнім панадворку Зінаіды Віткоўскай, у тым месцы, дзе была яма, у якой гестапаўцы пабілі навакольных сялян, стаіць абгароджаны праваслаўны крыж. На абочыне вуліцы ў Лазнях стаіць таксама вялікі праваслаўны крыж з мемарыяльнай табліцай у гонар 55 забітых бацькоў і дзяцей. 11 кастрычніка 1943 года расстраляна там пяць сем'яў з Лазняў, пяць сем'яў з Сакалды і адну сям'ю з Варонічаў. А за што — іх суседзі не ведаюць...

Аляксандр Вярбіцкі

Плюсы і мінусы

Зацікавіў мяне артыкул Я. Мірановіча „Савецкія кадры на Беласточчыне" ад 9 сакавіка 2003 года. Між іншым, аўтар піша: „1 лістапада 1940 г. у дзяржаўных установах Беластоцкай вобласці працавалі 8 283 палякі, 6 460 беларусаў, 1 168 рускіх, 3 392 яўрэі". Шкада, што „Ніва" не чытаецца ў польскім асяроддзі. Лікі сведчаць, што не ўсе палякі праследаваліся савецкай уладай, як аднабакова піша цяпер польскамоўная прэса.

Аб'ектыўная праўда такая, што калі адным жывецца дрэнна, то другім добра. У той далёкі ўжо час месца даваеннай адміністрацыі дасталася нашым мясцовым людзям. Савецкая ўлада спрыяла рабочым і малазямельным сялянам. Яны тады ўпершыню пачуліся гаспадарамі сваёй зямлі. Савецкая ўлада арганізавала па ўсёй Заходняй Беларусі 335 паліклінік, 200 бальніц. Было адчынена звыш 200 дзіцячых ясляў. У галіне асветы было адкрыта 5 643 школы, у тым ліку 4 278 беларускіх. Былі адчынены 4 педагагічныя інстытуты, 2 музычныя тэхнікумы і 8 музычных школ. У галіне культуры адчынена 100 кінатэатраў, мноства клубаў, бібліятэк, дамоў культуры. Гэта былі плюсы жыцця. Вялікім плюсам Народнай Польшчы было рэальнае права на працу. Пасля вайны людзі параўняліся і ўсіх сталі называць „панамі". Праўда, у сацыялізме мы менш зараблялі ў пераліку на долары, але кожны меў кавалак хлеба.

Цяпер на дзяржаўнай пасадзе служачыя зарабляюць значна больш, але зроблена гэта коштам 4 мільёнаў беспрацоўных. Беспрацоўе — вялікі мінус III Рэчы Паспалітай. Атрыбутамі масавага беспрацоўя з'яўляюцца: павышаная злачыннасць, бяздомнасць, жабрацтва, наркаманія, самагубствы. Беспрацоўныя адчуваюць сябе лішнімі, непатрэбнымі людзьмі. Каму цяпер у Польшчы добра жыць? Падобнае пытанне ставіў вядомы рускі паэт XIX стагоддзя Мікалай Някрасаў. У паэме „Каму на Русі добра жыць" Някрасаў гаварыў вуснамі мужыкоў, якія:

Сошлися и заспорили:
Кому живётся весело,
Вольготно на Руси?
Роман сказал: помещику,
Демьян сказал: чиновнику,
А я сказал: попу.
Купчине толстопузому,
Сказали братья Губины,
Иван и Митродор.
Пахом сказал: светлейшему
Вельможному боярину,
Министру государеву,
А Пров сказал: царю...

Здаецца, што ў нас цяпер падобная сітуацыя. Слаба жывецца сялянам, а найгорш рабочым. У іх няма перспектывы, бо праца сёння ёсць, а заўтра ты непатрэбен. Нядрэнна цяпер пенсіянерам. Ім рэгулярна выплачваюць пенсіі. У крамах многа тавараў, усё лёгка купіць, калі маеш грошы. Гэта плюс для нашай сучаснасці. Рыначная эканоміка, за якую змагаліся рэфарматары, мае свае плюсы і мінусы. Добра, калі ў жыцці многа плюсаў. Дрэнна, калі малады чалавек закончыўшы школу, не можа атрымаць працу. Паспрабуй „узяць справы ў свае рукі!" — як гаварыў адзін **вялікі рэфарматар**.

Мікалай Варанецкі

Памёр Ян Стрышко

Людзі прыходзяць на свет і адыходзяць з яго. Найчасцей жыццё абрываецца напрадвесні. Ян Стрышко на сваіх нагах пайшоў у шпіталь лячыцца. Праляжаў цэлы месяц. Але не суджана было, каб на нагах вярнуўся дамоў. Памёр ён 2 сакавіка г.г.

Нарадзіўся Ян Стрышко 23 лютага 1926 года ў вёсцы Коматаўцы што ў Гарадоцкай гміне. У 18 год прызваны быў у Савецкую Армію (у 1944 годзе Коматаўцы належалі да Беларусі). Пасля кароткага абучэння паслалі яго на фронт. Ваяваў пад Пултускам і Гданьскам, быў двойчы лёгка ранены. Пасля атрымаў моцнае раненне ў галаву і грудзі. Доўга ляжаў у шпіталі. Аднак суджана было яму жыць, хаця з моцна пахіснутым здароўем. Працаваў Ян Стрышко ў некалькіх прадпрыемствах у Беластоку, найдаўжэй у Кааператыве інвалідаў аховы маёмасці. На працягу ўсёй сваёй 27-гадовай прафесійнай працы быў на пасадзе кадравіка. А гэта вельмі адказная функцыя. Абцяжараны быў некаторымі грамадскімі абавязкамі, у тым ліку ў ЗБоВіД і Саюзе ваенных інвалідаў. Ян Стрышко ў свой час быў дзейным актывістам Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку. У Гарадскім аддзеле БГКТ шмат гадоў быў членам праўлення і нейкі час яго старшынёю. У свой час быў таксама членам Галоўнага праўлення БГКТ. Ян Стрышко ўзнагароджаны Кавалерскім крыжам Ордэна Адраджэння Польшчы, Залатым крыжам заслугі, сярэбранай адзнакай „Заслужаны Беласточчыне", а таксама шасцю медалямі і адзнакамі ды дзевяццю дыпломамі.

Міхась Хмялеўскі

Што такое беларускі сыр?

Амаль кожная еўрапейская краіна мае хоць бы адзін традыцыйны нацыянальны гатунак сыру. Хто не чуў пра англійскія чэдар ды стылтан, галандскія эдам і гаўда, французскія ракфор ды камамбер, італьянскія пармезан ды гарганзолу? Наяўнасць традыцыйнага нацыянальнага сыру, дый не аднаго — быццам пропуск у прывілеяваны клуб еўрапейскіх нацый. А што беларусы? Ці могуць пахваліцца годнымі нацыянальнымі сырнымі традыцыямі?

На жаль, беларускі сыр не мае сёння якога-кольвечы ўцямнага іміджу, аблічча не толькі ў свеце, але, што яшчэ больш крыўдна, у самой Беларусі. Нават прафесіяналы сёння прызнаюць, што амаль усе гатункі цвёрдых сыроў беларускай вытворчасці немагчыма адрозніць адзін ад аднаго. Як заўжды, вінаватыя нібыта „аб'ектыўныя прычыны": найперш, праблемы з малаком, якога ў пэўныя сезоны банальна не стае, не кажучы ўжо пра стабільнасць паказчыкаў якасці, уніфікаваныя тэхналогіі, адны і тыя ж ферменты (амаль усе — з Маскоўскага завода сычужных ферментаў — якая тут можа быць „сырная незалежнасць"!), матэрыялы пакрыцця і г.д. Невялікія варыяцыі ва ўтрыманні вільгаці і тлушчу ў сухім рэчыве, рысунак і форма — ну і тэрміны даспявання, якія за апошнія гады няўхільна зніжаюцца — вось і ўсе адрозненні, няўлоўныя для сярэдняга спажыўца.

Мала хто (спецыялісты-сыравары, магчыма, менш за ўсіх) задумваецца аб традыцыях беларускага сыру, аб культываванні яго нацыянальнай адметнасці.

Доўгія стагоддзі ў нас быў вядомы амаль выключна самы просты — тварожны, або клінковы сыр. Беларусы Беласточчыны яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму выраблялі яго са свежага вільготнага, нават не прэсаванага тварагу. Дзень пры дні ў драўляную бочку накладалі чарговую порцыю мяккага тварагу, толькі адліваючы сыроватку і моцна солячы кожны новы пласт, ды крыху ўтрамбоўваючы. Паступова бочка запаўнялася, сыр з цягам часу цвярдзеў, але не скісаў і яго звычайна ўжывалі як дадатак да хлеба пад час жніва. Такі сыр, самы прымітыўны нават у параўнанні з прэсаваным клінковым, адпаведна і быў самым танным з нашых сыроў. Калі яго заліваллі для лепшага захоўвання таплёным маслам, ён называўся „сырніца" ці „масленіца" — елі гэтую страву звычайна разагрэтай. Такая тэхналогія была вядомая раней не толькі на Падляшшы, але там яна, мабыць, захавалася даўжэй, чым у Савецкай Беларусі, дзе ўсе даўнія гастранамічныя традыцыі знікалі вельмі хутка пад уціскам калгаснага ладу. У беларусаў жа Падляшша заўжды, як піша Міра Лукша, *было на продаж ці дзецям тое яйка, сыр ці кумпячок*. Адно што цяпер, па далучэнні да Еўрасаюза — ці захаваюцца традыцыйныя, свае работы, сыры? Варта хаця б занатаваць, пакуль не позна, што яны з сябе ўяўлялі.

У гісторыі беларускага сыру і сыраварства, якую піша ніжэйпадпісаны, яшчэ шмат што трэба высветліць. Напрыклад, адкуль паходзіць традыцыя сыроў *Podlaski* ды *Tykociński* — і якой яе трэба лічыць — польскай ці беларускай — калі *літоўскія* сыры на самой справе менавіта беларускія? Адгукніцеся, хто памятае нешта пра мінулае нашага сыру! Любая дробязь можа аказацца істотнай дэталлю мазаікі, якую яшчэ магчыма сабраць.

Алесь Белы

Зав. Рабочы, 2, Навінкі, Мінскі р-н, 223059 Беларусь, bely@infonet.by

Фільмавы вечар

Вясна! Новыя сілы, магчымасці, і шмат новых фільмаў, якія трэба паглядзець. Ды чаго ж больш кінааматару? Ну, можа больш грошай, але і з гэтым можна справіцца. Пасля раздачы прэмій Оскара прапаную тры фільмы, якія найбольш спадабаліся заакіянскай публіцы.

„Чыкага" (*Chicago*) Роба Маршала, з Кэтрын Зета-Джонс, Рэні Зелвегер і Рычардам Гірам, гэта лаўрэат прэміі Оскара. Мюзікл з элементамі камедыі спадабаецца аматарам дэтэктываў.

Галоўная гераіня, Роксі Гарт, любой цаной хоча стаць слаўнай і каб гэтага дабіцца паслугоўваецца не толькі сексам, але і злачынствам, беручы прыклад са свайго куміра — Велмы Келі, найбольшай зоркі эстрады.

Ужо на самым пачатку бачым прыгожую жанчыну, якая даведаўшыся аб здрадзе мужа, які на любоўніцу выбраў яе сястру, забівае здрадніка і спакойна вяртаецца ў тэатр, дзе выступае ў спектаклі, які завяршаецца арыштам. Так выглядае Чыкага! Гэтай жанчынай з'яўляецца Велма.

У падобны спосаб за славу змагаецца Роксі, якая хоча быць лепшай за Велму, а публіка мае магчымасць паглядзець перамену нармальнай дзяўчыны ў секс-бомбу!

Вялікую ролю адыгрывае адвакат жанчын Білі Флін, які аказваецца майстрам у сваёй прафесіі, а доказам гэтаму з'яўляецца сцэна з журналістамі. Але не скажу як закончыцца гэтая гісторыя.

Найноўшы фільм Стывэна Спілберга „Злаві мяне, калі зможаш" (*Catch me if you can*) гэта камедыя, якую прапаную на халодныя дні. Яна аснавана на сапраўдных фактах і расказвае гісторыю маладога чалавека, які пасля разводу сваіх бацькоў, дзякуючы вялікай інтэлігэнцыі і лоўкасці, у кароткім часе становіцца мільянерам.

Семнаццацігадовы Фрэнк Абагнэйл (у гэтай ролі Леанарда Ды Капрыё) уцякае з хаты і ў просты спосаб пачынае „рэвалюцыю". Працуе пілотам, юрыстам, доктарам. Фальсіфікуе чэкі, дыпломы, а ФБР не можа ніяк яго знайсці, але паяўляецца агент Карл Хенраці, які цярпліва і спакойна даходзіць да таго, што становіцца нават сябрам Фрэнка. Але ці арыштуе яго?

На экране пабачым яшчэ такіх акцёраў, як Том Генкс, Марцін Шын і Эмі Адамс.

На канец прапанова для дзяцей. У кіно трапіла другая частка „Кнігі джунгляў" (*The Jungle Book 2*) — аднаго з лепшых фільмаў для наймалодшых. Галоўны герой — Маўглі — дарастае. З аднаго боку цешыцца, што мае новую, сапраўдную сям'ю, а з другога — сумуе за жыццём і сябрамі з джунгляў. Найбольш бракуе яму мядзведзя Балу, які таксама ўсякімі сіламі хоча спаткацца з хлопчыкам. Але калі паяўляецца небяспечны тыгр Шэр-Хан, старыя сябры з джунгляў памагаюць хлопчыку, а іх прыгоды выклікаюць не толькі смех, але і жах!

Паўліна Шафран

Паліцэйскі патруль

У нядзелю 23 сакавіка г.г. давялося мне пабываць у Беластоку. На вакзале ПКС падышоў да мяне старэнькі чалавек з кульбай. Сказаў, што ён ветэран, пражыў дзве сусветныя войны, яму больш за сто гадоў і хоча даехаць у Дом ветэрана, які знаходзіцца недзе каля Кнышына. На жаль, ніхто яму не можа дакладна сказаць, дзе канкрэтна знаходзіцца той дом і як туды даехаць.

Але пачула нашу гутарку жанчына, якая паінфармавала, што дом ветэрана знаходзіцца ў мясцовасці Зафіюўка, у 25 кіламетрах ад Кнышына. Сказаў яшчэ той старэча, што паходзіць з-пад Ломжы. Я параіў яму пайсці ў інфармацыю ПКС, там напэўна дакладна паінфармуюць як даехаць у Зафіюўку. У той час аўтавакзал наведаў паліцэйскі патруль. Я падышоў да паліцыянтаў і аб усім расказаў ім. Адшукалі яны таго чалавека і забралі ў самаход, а мне сказалі, што яны дапамогуць старэчу ва ўсім, толькі праверацъ, ці яго сям'я часам не шукае.

Я праз пасрэдніцтва „Нівы" хачу падзякаваць паліцыянтам за іх ветлівасць і дапамогу чалавеку ў бядзе.

Мікалай Лук'янюк

На рынку ў Кляшчэлях

Наведаў я Кляшчэлеўскі кірмаш 10 сакавіка. Купцоў ды гандляроў было больш чым пакупнікоў. Сяляне прадавалі збожжа ды парасят. За апошнія цанілі ад 150 да 200 зл. за пару, за жыта прасілі па 35 зл. за цэнтнер. Ячмень і авёс на пяць злотых больш. Ахвотных купляць было зусім мала.

На прылаўках найбольш было фруктаў. Яблыкі прадаваліся ад 80 гр. да 1,30 зл. за кілаграм. Дарэмшчына, калі параўнаць з цэнамі дву-трыгадовай даўнасці. Як заўсёды прапанаваліся запчасткі да сельскагаспадарчых машын, корм для жывёлы, вопратку і абутак. Суседзі з-за мяжы рэкамендавалі рэчы дамашняй кухні ды спіртное і цыгарэты. Тавар без акцызнай маркі прадаваўся спадцішка. Адно дрэннае я заўважыў. Гмінная служба неакуратна расчысціла пляцоўку. Хто раней заехаў, дык цяжка было назад выбрацца. Наслухаўся затым непатрэбных лаянак. Шкада толькі, што працаўнікі гміны, якія збіралі „пляцовэ" адным вухам слухалі, а другім выпускалі. А так быць не павінна.

(ус)

Музейны фонд

Грамадскі камітэт пабудовы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы праводзіць збор грошай на пабудову музея. Ахвяраванні на пабудову музея (у польскай і замежнай валютах) просім пералічваць на рахунак: **PKO BP S.A. O/Hajnówka, nr konta: 26 10201332 100120228.**

Спіс чарговых ахвяравальнікаў:

5 132. Міраслаў Мордань (Гайнаўка) ..... 58,00 зл.
5 133. Ян Жамойцін (Варшава) ..... 50,00 зл.
5 134. Мікалай Суліма (Гайнаўка) ..... 24,00 зл.
5 135. Войцех Курыла (Дубіны) ..... 50,00 зл.
5 136. Валянціна Клімюк (Гайнаўка) ..... 50,00 зл.
5 137. Іаланта Грыгарук (Гайнаўка) ..... 50,00 зл.
5 138. Дары сабраныя ў скарбонку ў Музеі ..... 148,00 зл.
5 139. Міхал Панфілюк (Нараўка) ..... 50,00 зл.
5 140. Ян Ляшчук (Гайнаўка) ..... 24,00 зл.
5 141. Дары сабраныя ў скарбонку ў Музеі ..... 201,00 зл.
5 142. Юліян Казбярук (Гайнаўка) ..... 30.00 зл.
5 143. Турыстычнае бюро „BUMERANG" (Бельск-Падляшскі) ..... 50,00 зл.
5 144. Канстанцін Сіняковіч (Гайнаўка) ..... 100,00 зл.
5 145. Турыстычнае бюро „BUMERANG" (Бельск-Падляшскі) ..... 50,00 зл.
5 146. Уладзімір Іванюк (Вітава) ..... 25,00 зл.
5 147. Віктар Бура (Гайнаўка) ..... 24,00 зл.

Дзякуем. Наш адрас: **Społeczny Komitet Budowy Muzeum i Ośrodka Kultury Białoruskiej, 17-200 Hajnówka, ul. 3 Maja 42, tel. (085) 682 28 89.**

Гайнаўка

Конкурс на крашанае яйка

Гайнаўскі дом культуры запрашае дзяцей, моладзь і дарослых асоб да ўдзелу ў конкурсе „На найпрыгажэйшае крашанае яйка і велікодную аздобу". Працы трэба прынесці або даслаць у пластычную майстэрню ГДК, вул. Беластоцкая 2, да 17 красавіка г.г. Дэталёвыя інфармацыі можна атрымаць па тэлефоне 682-32-03, унутраны 39.

Падвядзенне вынікаў і ўручэнне ўзнагарод адбудзецца падчас адкрыцця пасляконкурснай выставы ў ГДК 23 красавіка (пачатак у 10 гадзін).

Янка Целушэцкі

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

http://www.anekdotov.net/

Факты і высновы

Тактыка

На пачатку лыжнага сезона малышаманы азмрочыліся. Кумір здае пазіцыю? Як бы не так! Неўзабаве друк выявіў прычыну слабога старту.

Małysz ten sezon zaczął tak, jak mu radziłem. Nie za mocno. Ale powinien cały czas być w okolicy podium. Żeby miał poczucie siły, lecz żeby nie było tej presji, że musi wszystko wygrywać.

Гэта гаварыў прэзідэнт Рэчы Паспалітай. Малыш паслухаў... і выйграў Кубак свету.

Olek na trenera!

Цёзкі

„Nasz Dziennik" адкрыў, што кардынал К. Вайтыла, едучы на памятны канклаў 1978 г., забраў з сабою і „Капітал" К. Маркса.

А краёвыя талібы выдварылі цёзку папы з усіх бібліятэк, хоць Ватыкан чытаць Маркса не забараняе.

Ціха-а-а...

Медыйны патэнтат Солёж аднавіў прызабытае правіла: Trzeba wychodzić z założenia, że wszystko i wszędzie jest na podsłuchu. I wtedy człowiek jest spokojny, zastanawia się, co mówi.

Парада карысная не толькі палітыкам. Асабліва ў эпоху электроннага наступу.

Сідар Макацёр

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

— Мой сын ідзе ў школу з захапленнем!

— У каторы клас?

— Ён дырэктар школы.

* * *

Дзедка да ўнука:

— Прызнаюся табе, што ў сваім жыцці я любіў пятнаццаць жанчын...

— Раней казалі, што пяць?..

— Магчыма, але тады я яшчэ не ведаў усёй праўды.

* * *

Бабулька да ўнука:

— Калі я была маладая, музыка была мілейшая і больш меладычная...

— Бабулька, я цяпер уключыў не магнітафон, а кафямолку.

Адгаданка

Запоўніце вызначаныя дарожкі адгаданымі словамі (у дужках названы першыя літары іх). У светлых палях атрымаецца рашэнне адгаданкі: афарызм і прозвішча яго аўтара.



1. H_2O (В), 2. вадкасць, якую праліваюць на вайне (К), 3. сталіца Латвіі (Р), 4. вялікая рыбалоўная сетка (Н), 5. зброя цара Давіда (П), 6. адзінка сілы, што масе ў адзін грам надае паскарэнне ў адзін сантыметр у секунду (Д), 7. месца, дзе пасуць жывёлу (В), 8. лінія роўна размешчаных аднароднвх прадметаў або частка тэксту напісаная ў адну лінію (Р), 9. маці (М), 10. рэшткі разбуранага збудавання (Р), 11. вынаходца шрыфту для невідушчых аснованага на камбінацыі шасці выпуклых кропак (Б), 12. паэт і музыкант, выканаўца ўласных песень; гэтаму спеваку прысвечана восеньскае мерапрыемства ў Бельску (Б). (Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, разыграем кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 8 нумара

Адплывае спакойнае неба.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

Вясна!

Рашыў я сёлета, як толькі пацяплее, падацца з Агатай на прыроду і пакачацца ў траве. На Юр'я. Толькі што і не вельмі як — якраз у той дзень едзем на прыхадское свята ў Семяноўку. Народ святкуе, а ты папрэш у лес і на паляне бухнешся ў траву? Або і на лузе, каб усе бачылі?..

— Старыя дурні, якім апроч нейкіх паганскіх звычаяў у той вымнутай кашчавымі целамі траве невядома чаго захочацца! Гэтак пра нас падумаюць! — замахала рукамі мая жонка.

— Агата! — падняў я палец. — А чаму ж і не? Твая ж сяброўка Крыська са Швецыі, унучка знахаркі з Банькоў, якой так вельмі верыш, казала ж, што трэба крыжам бухнуць на зямлю і ляжаць так, каб прырода з цябе выцягнула ў той час усю кепскую энергію. Ёй яна не шкодзіць, а табе — так. А, можа, лепш... на цябе? Ты ж таксама натуральная.

Агата аблілася чырванню.

— Табе, Ванька, дык зусім ужо крыша паехала. У наш узрост такія дурныя жарты!

Крыська, праўда, не жартавала. Я сам выпрабаваў такую справу: пасля тыдня кепскіх атмасферных і іншых уплываў на маю асобу паехаў я аўтобусам нумар 10 на Клеасін, прайшоўся ў лясок, там і добра пакачаўся, і крыжам паляжаў, жыватом уверх, на неба паўзіраўся, даў мурашкам ды іншым казуркам па сабе палазіць... І ўстаў як новы. Праўда, пасля крышку скрабла ў касцях, бо хіба зноўку, як заўсёды, забавіўся я ў сваю тыповую „пэрэсаду". А добры-добры быў тады, і для Агаты, і для суседак... Усіх бабулек пераводзіў праз вуліцу... Хацелася нават дзяўчынак за коскі тузаць... Настолькі амалодзіўся, што ледзь не здзяцініўся — здаецца, на тое гэта выйшла, той мой блізкі кантакт з прыродай...

— Нікуды я не паеду, бо падвядзеш мяне пад дурнога хату.

— Ты што, на Юр'я ў Семяноўку ехаць не хочаш?

— Паеду на прыхадское свята, але ні ў які лес! Шчэ чаго!

Але ўдалося выцягнуць Агату на прыроду яшчэ ў красавіку. Нічога не падазравала. Бо і зіма даўгавата сёлета трымалася, і буслоў доўга не было. Ды што я пра буслоў! — яны больш небяспечныя для маладых сужонстваў.

Паехалі мы ў Целушкі. З Яцкам Зеленюком пабачыцца, што там хату сабе купіў. Хата як хата, ніякая там не дача — паглядзела мая жонка, якая мне ўжо Яцкам і іншымі больш аператыўнымі дый маладзейшымі маімі калегамі ў вочы пора. І старыя будыніны пакінуў, хоць там нічога не трымае — нейкія хляўчукі, шопкі, штосьці накшталт адрынкі. Пахадзілі мы з Агатай па ваколіцы, нанюхаліся веснавога паветра, дык зусім ап'янелі. Многа там старым трэба! Бухнуліся проста на сена ў напаўрасчыненай адрыне. Сена было там няшмат, і немаладое, ды ўсё ж яшчэ больш закурылася ў галаве...

— Вандал, коціку... — выдыхнула Агата. — Ой, як добра так паляжаць...

— І ніякіх думак у галаве, ніякага клопату... — наставіў я твар да сонца, што забягала праз дзверы.

— Як — ніякіх думак?! — занепакоілася раптам Агата. — А пра што ты мне гаварыў?

— Да Юр'я далёка...

— А прычым тут Юр'я!

Дык і юркнуў я, уздымаючы пыл са старога сена.

Вандал Арлянскі

Наш мёд, у нашы лапы

— Ну, мае вы дарагія, будзем прыватызавацца, — пачаў чарговы сход уселяснога кіраўніцтва мядзведзь Сандар Жоржавіч.

Вавёрка Кацюша глянула з трывогай на лань Гаўрусіху. Не магла нават дадумацца, што можа скрывацца за заявай мядзведзя, тым больш, што недачувала.

— Будзем... прэзентавацца? Ну, у мяне дык яшчэ салідная кіта, а, возьмем напрыклад, таго дзіка Свіналыча — што ён будзе прэзентаваць? — адважылася перапыніць Сандара.

Дзік толькі нервова хрумкнуў. Нічога не сказаў, бо ж таямніцай шыншылы было, што на вавёрку дзень да сходу зваліўся арэх вялікі як мядзведжая лапа і Кацюшы ў галаве крышку памяшалася, а перш за ўсё яна прыглухла.

Мядзведзь пра тое ўжо ведаў. Наблізіўся да вавёркі, нахіліўся да яе вуха і зароў:

— Пры-ва-ты-за-вац-ца!

— А-а-га, — уцяміла вавёрка.

— Не будзе ў нас, як у іншых лясах, бандыцкай прыватызацыі. Наша будзе харошая, — працягваў Сандар Жоржавіч. — Пачнем ад спрыватызавання бяроз што сокам цякуць.

— Але ж, шаноўны мядзведзь, бярозавы сок быў заўсёды ўселясною ўласнасцю. Калі яго аддаваць, дык у чые лапы? — нясмела заўважыў дзяцел Стукач.

— То ж вам гавару, што прыватызавацца будзем. Значыць, бярозавы сок будзе ўласнасцю нашай: уселяснога кіраўніцтва, прадстаўніцтва ўсяе лясное браціі, значыць, маёй, — тлумачыў Жоржавіч.

— Ага, калі гэта так, то я не скажу на інак, — пачаў няскладна рыфмаваць дзяцел.

— Ваша заданне — пераканаць лясную брацію да масавага карыстання бярозавым сокам, а не нейкімі там моцнымі мядамі. Ад таго залежыць поспех нашай прэзентацыі.

— Прыватызацыі, — паправіла мядзведзя Кацюша.

— Бр-р! — буркнуў Сандар Жоржавіч і нічога больш не сказаўшы, падаўся ў сваю бярлогу.

Вярнуўшыся, яшчэ раз пералічыў запас мядовых бочак. У думках падвёў рахунак, наколькі ўзбагацее на прыватызацыі бярозавага соку, на колькі чарговых бочак з мёдам зможа сабе дазволіць.

— Ой, будзе мёдам плыла мая бярлога, — аддаўся мроям, аблізваючыся.

Тым часам вавёрка Кацюша перасквала з дрэва на дрэва ды спрабавала не забыць:

— Прыватызацыя, прэзентацыя. Прэзентацыя, прыватызацыя.

Аднак, ад таго ўчарашняга ўдару арэхам у цемя ўсё ёй мяшалася ў глуздах.

— Прэзентывацыя, прывантацыя...

Урэшце махнула хвастом:

— А на лесуна з усім гэтым! Падскочу на ўскрай узлеску, у паблізак Уладзімірскага. Спрэзентую кіту, яна ж, адкуль дыхаю, у мяне прыватная. Харошая мая ўласнасць, відная, пухнатая. Можа, пару арэхаў на ёй зараблю ад уладзімірскага капіталу?

МакХолад

ISSN 0546-1960